Януш Корбель ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Люба і Уладзімір ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 8 (2650) Год LII Беласток, 25 лютага 2007 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Вандроўкі малыя і вялікія

Чытачу „Нівы” не трэба прадстаўляць мастака-дызайнера Міраслава Здрайкоўскага. Яго ілюстрацыі сустракаем у кожным нумары нашай газеты. Гэта рысункі да сатырычных быляў Віктара Сазонава, гэта партрэты свойскіх індывідаў Евы Сцепанюк, гэта суаўтар новага графічнага афармлення „Нівы” з 2004 года...

Мы запрашаем на „Вандроўкі малыя і вялікія”, другую персанальную выстаўку мастака, якая з 13 лютага па 23 сакавіка г.г. прэзентуецца ў Ружовай зале беластоцкага ВАА-Ка (што па вуліцы Кілінскага, 8).

— Адкуль такое глыбокае адчуванне этнаграфіі? — пытаю Міраслава Здрайкоўскага, мяшчаніна родам з Бельска-Падляшскага.

— Мае бацькі з вёскі. У час канікулаў я ездзіў да дзеда, у Стацэвічы. Гэтыя ўспаміны важныя для мяне, яны паказваюць дарогу адкуль я ўзяўся.

Пытанне пра этнаграфію невыпадковае. Гэта прастора, у якой закляты дух народа. З яе пачынаецца „вандроўка далёкая”. Вядзе яна да ядра-дому, які састаўляюць чатыры карціны з хаткамі. Хаткі — вобраз тутэйшага чалавека — пад аховай пукатай атуліны. Гэта курганная пасудзіна або пупышка расліны. Хаткі павернуты здобным франтонам на гледача.

Яны выпраменьваюць цёплае святло сваімі „вачыма”-вокнамі, якое са стужкай дыму ўзвіваецца ў неба. Аднак, каб знайсці паслядоўнасць у часе (тут метанакіравана пераблытаную), неабходна прыгледзецца ўсёй кампазіцыі, гэтак званым вандроўкам „малым”. Саставляюць іх ніўскія, ды не толькі, ілюстрацыі. Пачатак дарогі (яна ў выглядзе характэрнай рыскі) знаходзім у археалогіі. Гэта рыска-аздоба на гаршку з людскім прахам. Далей сустрэнем яе на шчыце беларускага рыцара і на этнічнай тканіне праллі. Рыска ўецца па чырвоным муры беларускай готыкі — бачым яе на сцяне Супрасльскай лаўры. Бачым яе сёння — як высцілае снежнай палоскай страху „глабальнай вёскі”. А ў перспектыве будучыні — памяць дарогі-рыскі зафіксаваныя ў раслінцы.

Прычым расліна тут сімвалічна-эстэтычная — гэта беларускі васілёк.

Прыгадайма, на першай персанальнай выстаўцы Міраслаў Здрайкоўскі ў асноўным паказаў свой прафесійны дызайн (працаваў тады для камп’ютэрнай фірмы), прысвечаны кібермедыйным сферам, Інтэрнэту. Бяскроўную віртуальшчыну паказаў ён з вялікай дозай гумару, ажывіў яе колерам і гістарычным кантэкстам. Сучасныя прэзентацыі накіроўваюць нас у асабісты свет мастака. Гэта зварот у бок каранёў, у бок свету дзядоў і прадзедаў. Гэта ўвага для этнаграфічных прадметаў, у якіх, быццам у люстры часу, можна пабачыць сучаснасць і яго эстэтыку. Эфект ашарашвае. Напрыклад, дызайн-абстракцыя на аснове структуры плеценага кошыка. Або мастацкі дыялог (на аснове той жа структуры кошыка) са знакавай карцінай Фердынанда Рушчыца — „Зямля”.

Паколькі Міраслаў Здрайкоўскі ўжо трэці раз прэзентуе свае працы ў згаданым месцы, яго апякун, Адам Слефарскі, выказаў сваё меркаванне:

— У прэзентацыі бачым адметную рыску і творчы працэс. А мастак, Міраслаў Здрайкоўскі, самае галоўнае, развіваецца.

— Мастак павінен быць пладавіты, czego sobie i wam życzę! — падвёў усё аўтар „Вандровак”. Міраслаў меў у руках вельмі канкрэтны доказ — сынка Міколку. Яму і жонцы Марысі прысвяціў ён свае прэзентацыі. Мяне асабіста захапіў дыялог паміж выстаўкай (амаль уся пасудзіна мае тут пузаты кшталт) і канкрэтнай пладавітасцю публікі. На вернісажы я налічыла шэсць цяжарных маладзічак у каляровых сукенках.

Таксама дарога ў галерэю, якая ў гэты вечар замянілася ў сапраўдную коўзанку ды застаўляла азірацца на пліткавы тратуар, таксама напамінала структуру плеценага кошыка.

Выглядае на тое, што пачалася новая „вандроўка” ў Міраслава Здрайкоўскага.

Тэкст і фота Ганна КАНДРАЦЮК

Міраслаў Здрайкоўскі

нарадзіўся ў 1972 годзе ў Бельску-Падляшскім. У 1991-1993 гадах вучыўся ў Варшаве на курсах для настаўнікаў мастацкага выхавання. Закончыў Беларускую акадэмію мастацтваў у Мінску на аддзяленні праектавання выставак і рэклам. З’яўляецца слухачом Іканапіснай школы ў Бельску-Падляшскім. Працуе праектантам-дызайнерам у друкарні ў Беластоку. Ён удзельнік дзвюх персанальных і дзвюх калектыўных выставак.

„Ніхто не хацеў кіраваць”

☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Цікавая гэта рэч — найноўшая беларуская гісторыя. Так хацелася б зазірнуць хоць бы на пяцьдзесят-семдзесят год наперад і пачытаць, што там будуць пісаць гісторыкі і палітолагі пра дзень сённяшні. А паколькі гэта маларэальна (а раптам, хто можа?), даводзіцца чытаць і слухаць сучаснікаў...

Добра нам жывецца (2)

☞ 4

Раіна СТЭФАНЧУК

Апошнім часам апісалі мы стан маёмасці самаўраднікаў, засядаючых у Падляшскім сейміку і беластоцкай Гарадской радзе, а якія выводзяцца з беларускага асяроддзя. У гэты раз прадстаўляем маёмасць выбраных старостаў, бурмістраў і войтаў з тэрыторый, дзе ў большасці жыве беларуская меншасць...

Гукі Гарадоччыны

☞ 9

Ілона КАРПЮК

Едучы ад Міхалова відаць палі і залатыя купалы царквы, ад Беластока брукаванай дарогай пад’язджаеш пад запраўку ды гатэль. Гэта два самыя папулярныя краявіды на Гарадоцкай зямлі, яшчэ лес, у далінах, на ўзгорках, пры шашы. Лірычны вобраз штодзённасці мае аднак сваё святочнае аблічча. Пару разоў у год нібыта паломніцтва цягнуцца сотні людзей у таямнічы кусок лесу. Урочышча Барык. Дзіўная Мекка як на цяперашнія часы...

http://www.tsesler.com/

Можа іншае сонца

☞ 9

Раіна СТЭФАНЧУК

У Мінску па вуліцы Першамайскай знаходзяцца мастацкае атэлье, клуб, сталоўка, гатэль, месца сустрэч людзей цікавых жыцця і адкрытых на іншых. Не заўжды пакорлівых. Усё ў адным. Гэта майстэрня Уладзіміра Цэслера. Да нядаўна жыў і ствараў тут Сяргей Войчанка. Сёння няма яго ў жывых. Абодвух яднала неразрыўная мастацкая вязь. Далей іх спалучае. Падпісаныя абодвума мастакамі працы можна ад мінулага тыдня глядзець у варшаўскай галерэі „Зоя”...

9 770546 196000

„Ніхто не хацеў кіраваць”

Цікавая гэта рэч — найноўшая беларуская гісторыя. Так хацелася б зазірнуць хоць бы на пяцьдзесятсемдзесят год наперад і пачытаць, што там будуць пісаць гісторыкі і палітолагі пра дзень сённяшні. А паколькі гэта маларэальна (а раптам, хто можа?), даводзіцца чытаць і слухаць сучаснікаў.

Галоўнае пытанне аналітыкаў і палітыкаў цяпер у тым, ці магчымы ва ўмовах жорсткага маскоўскага прэсінгу агульнабеларускі „круглы стол” з удзелам кіраўніцтва дзяржавы з аднаго боку і апазіцыі з іншага. Праводзяцца нават параўнанні сённяшняй сітуацыі ў Беларусі з польскай у канцы існавання ПНР. Рознасць, на мой погляд, відавочная. Папершае, вярхоўная ўлада позняга перыяду польскага сацыялізму не была настолькі персаніфікаванай, падаецца, што нейкія важныя пытанні дзяржаўнай палітыкі маглі тады развязвацца калегіяльна. Цяперашнія ж беларускія рэаліі такія, што практычна ўсё вырашае адна асоба. Па-другое, апазіцыя занадта раздробленая і блізка не ёсць адзінай маналітнай сілай. А са слабымі ніхто не будзе весці перамоваў. Таму такі круглы стол пакуль уяўляецца з цяжкасцю.

Цэнтральнай датай надыходнай вясны мусіць стаць 25 сакавіка. На сёлетні Дзень Волі робіцца асноўная стаўка апазіцыі і ўскладаюцца чарговыя спадзяванні. Усе разумеюць, што цяпер няма і намёку на беларускую рэвалюцыю, надзеі толькі на эвалюцыйны шлях, які прывядзе да пераменаў. Тым не менш, да масавай акцыі 25 сакавіка на вуліцах Мінска заклікаюць і Аляксандр Мілінкевіч, і Зянон Пазьняк, і кіраўнікі колішняй кааліцыі „5 плюс”. Але адзінства і блізка няма. Днямі старшыня Палітрады аб’яднаных дэмакратычных сіл Аляксандр Мілінкевіч заявіў пра тое, што ён не будзе браць удзелу ў чарговым Кангрэсе дэмакратычных сіл (ён прызначаны на 17-18 сакавіка), а галоўная справа — гэта менавіта Дзень Волі. Старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка на гэта сказаў, што „мы разумеем, што кангрэс без Мілінкевіча — гэта ўжо не кангрэс аб’яднаных дэмсілаў, але і Мілінкевіч без аб’яднаных дэмсілаў — гэта ўжо не ўсеагульны лідэр”. Кааліцыя партый прыняла пастанову, што 25 сакавіка будзе ладзіцца толькі ў Мінску, каб не распыляць рэгіянальныя сілы. А старшыня Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ Зянон Пазьняк заявіў, што менавіта яго партыя будзе праводзіць акцыю на Дзень Волі, прычым і ў іншых гарадах. Тут шаноўны Зянон Станіслававіч, светагляд якога асабіста мне найбольш блізкі, відавочна пагарачыўся — рэальных сілаў, каб правесці масавыя акцыі ў некалькіх гарадах, у КХП, на жаль, няма.

Не застаўся ў баку і Сцяпан Сухарэнка — кіраўнік „усемагутнага” дзяржаўнага ведамства — КГБ. С. С. заявіў, што вясна пройдзе спакойна і „беспарадкаў” улада не дапусціць. Прытым ідзе мэтная зачыстка моладзевых арганізацый. Галоўная прычына, па якой доблесныя чэкісты і камісары ў пыльных шлемах так накідваюцца на кожны альтэрнатыўны моладзевы рух, гэта збіць патэнцыйны запал выходзіць на вуліцу. Разлік зразумелы. Старэйшае і сярэдняе апазіцыйнае пакаленне ўжо моцна стамілася з году ў год хадзіць на плошчы пад дубінкамі і арыштамі. А вось моладзі заўсёды ўласцівая большая радыкальнасць.

У беларускай апазіцыі цяпер так: усе імкнуцца ў лідэры да чарговага „дня ікс” і пасля гэтага дня, але ніхто не хоча быць лідэрам менавіта ў „дзень ікс”. Так было, прыкладам, 19 сакавіка 2006 года, калі некалькі гадзін трыццаць тысяч мірна, але цвёрда настроеных людзей не ведалі чаго яны прыйшлі на цэнтральную сталічную плошчу і што ім рабіць. Вось у такія крытычныя моманты (а іх за дзесяць апошніх год было некалькі), парафразуючы назву знакамітага кінафільма, можна сказаць, што „ніхто не хацеў кіраваць”. А праз тыдзень — 25 сакавіка — лідэрства на сябе ўзяў Аляксандр Казулін. Не буду тут казаць пра матывы яго дзеянняў, бо папросту не ведаю іх, а кожная думка будзе толькі паверхоўнай версіяй. Але вынік вядомы — надзвычай жорсткае пакаранне аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты...

25 сакавіка бягучага года стане святам усіх патрыётаў Беларусі. Але яно чарговы раз не стане, што вельмі шкада, днём паразумення і адзінства дэмакратычных сіл.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Расія і мы (2)

А цяпер давайце вернемся да пытання — Расія і мы, нашы тутэйшыя беларусы. Дзеля гэтага зробім кароценькі экскурс у гісторыю Беларусі і нашай Беласточчыны.

Спачатку называлі нас русінамі і жылі нашы продкі ў нашых русінскіх княствах. Першай хрысціянскай рэлігіяй стала ў нас візантыйскае хрысціянства.

У Вялікім княстве Літоўскім і пазней пачалі называць нас беларусамі, ліцвінамі. Спачатку добра мелася там наша беларушчына і праваслаўная вера. Многія вучоныя называюць гэты перыяд залатым векам беларускай культуры.

Радыкальна пачала змяняцца наша сітуацыя пасля Люблінскай уніі ў 1569 годзе, калі мы сталі грамадзянамі Першай Рэчы Паспалітай. Там памаленьку пачалі абмяжоўваць, а потым і зусім выціскаць нашу мову, культуру і праваслаўную рэлігію. Тадышняя палітыка Польшчы была такой, каб пашырыць каталіцызм, а калі не каталіцызм то хаця б уніяцтва, коштам праваслаўя. Навязваючы нашым продкам рэлігійную унію каталіцкаму кліру і правячым Польшчай рупіла тое, каб праваслаўную Беларусь і Украіну падпарадкаваць Ватыкану і тым самым мацней звязаць іх з суперкаталіцкай Польшчай і спаланізаваць іх. І рабілі гэта доўга, сістэматычна і бескампрамісна. Вось таму да канца існавання Першай Рэчы Паспалітай, гэта значыць, да раздзелаў Польшчы, так мала асталося ў Беларусі праваслаўных. Асноўная маса беларускага народу была ўжо уніятамі. Нямала было і католікаў. А беларуская нацыянальная эліта і паны, каб не пазбавіць сябе прывілеяў, пераходзілі ў асноўным на каталіцызм. Значыць, і чуліся яны ўжо больш палякамі, як беларусамі...

Нялёгка жылося беларускаму народу і пасля далучэння Беларусі да Расіі, у выніку раздзелаў Польшчы. І беларусы праваслаўныя, і беларусы уніяты, і беларусы католікі надалей былі ў поўнай эканамічнай і юрыдычнай залежнасці ад таго ж самага польскага пана, які надалей быў поўным гаспадаром у сваім маёнтку, так і новага рускага памешчыка. Польскі пан хацеў бачыць свайго падданага католікам і палякам, а рускі — праваслаўным і рускім. Беларус у Беларусі быў заўсёды перад кімсьці вінаваты...

Беласточчына трапіла ў склад Расіі крыху пазней — пасля Тыльзіцкага міру ў 1807 годзе. І прабыла ў складзе Расіі да бежанства ў 1915 годзе.

Пад канец трыццатых гадоў XIX ст. царызм рашыў вярнуць уніятаў і, па меры магчымасці, католікаў на лона Праваслаўнай царквы. І рабіў гэта таксама грубым, бескампрамісным спосабам, зусім не лічачыся з воляй саміх беларусаў...

Важнай і карыснай падзеяй была адмена прыгоннага права і зямельная рэформа ў 1861 г. Гэта быў вялікі зрух у цэлай Расіі. Моцна адчуўся ён і на нашай сучаснай Беласточчыне. У нашых гарадах і сёлах пачалі адкрывацца народныя школы, бібліятэкі, пачалі пракладацца бітыя дарогі і чыгунка. Не толькі ў гарадах, але і ў вёсках адкрывалі, апрача пачатковых, таксама і сярэднія школы, напрыклад, у Трасцянцы. Паволі, але пераканаўча, пачала развівацца навука, асвета. І была гэта асвета не для выбраных, а ўжо для мас. Да бежанства ў 1915 годзе ў кожнай большай нашай вёсцы былі ўзведзены школьныя будынкі і працавалі ў іх някепска падрыхтаваныя настаўнікі. А ўсё гэта прычынілася ў сваю чаргу да паяўлення нашай інтэлігенцыі. З нашых сялянскіх сем’яў пачалі выходзіць і святары, і настаўнікі, і афіцэры, і пісары і іншыя чыноўнікі. Яны пачалі займаць розныя пасады ў разбудаваным дзяржаўным апараце. Ім давяралі і павышалі іх па службе. Па-мойму, гэта быў добры, спрыяльны перыяд для нашага народа...

Наступны перыяд — час бежанства. Гэта перыяд страху, голаду ды людскіх і матэрыяльных ахвяр. Ён адкінуў наш народ, у яго развіцці, на гадоў пяцьдзесят назад. Доўга, доўга прыйшлося нашым бацькам і дзядам выжываць і лечыць бежанскія раны... І ўся віна за іх ляжыць тут на Расіі.

Тыя ідэі і парадкі, якія прынеслі з сабой да нас саветы ў 1939 годзе, апрача, канешне, школьніцтва, былі ненайлепшай пробы. Ні парадку, ні дабрабыту нам не далі яны, а пакрыўдзілі народу многа...

Падобна было і ў 1944-1945 гадах. Зноў усё паставілі з ног на галаву. Усюды шукалі ворагаў, прыдзіраліся да крыху замажнейшага сялянства. Назойліва і абманна праводзілі рэпатрыяцыю, высылаючы наш даверлівы народ у галодную, халодную і зусім непадрыхтаваную прыняць іх Расію. Вельмі варожа былі настаўлены яны да нашых хлопцаў і дзяўчат, сілай вывезеных на прымусовыя работы ў Германію. Маглі пасадзіць іх ці адправіць у штрафныя роты. А хто з нашых запісаўся, напрыклад, палякам, таго далікатней патрактавалі. Чаму?! Мы ж браты-славяне, праваслаўныя і заўсёды адносіліся да іх прыхільна, з сэрцам, а яны да нас чамусьці былі ліхой мачахай.

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

У „Чытэльніку” (2)

У апошні час зноў завітаў я ў Варшаву. Зноўку трапіў я ў культавы рэстаран, які знаходзіцца ў падвалах шанаванага літаратурнага выдавецтва „Чытэльнік”. І як звычайна ў абеднюю пару паявіліся тут легенды польскай культуры. За сваімі столікамі заселі вялікі акцёр Густаў Галёўбэк, вялікі пісьменнік і рэжысёр Тадэвуш Канвіцкі. Было яшчэ больш дзесятка іншых шаноўных, а ўжо пажылых знакамітасцей. Я адважыўся і паразмаўляў з Галёўбкам і Канвіцкім. Калі я рабіў здымак Тадэвушу Канвіцкаму (за яго дазволам), неміласэрна мне дрыжалі рукі.

— А чаго ж вы так трасецеся? — з усмешкай і спакойна спытаўся ў мяне аўтар „Календара і клепсідры”.

Я нервова глытаючы сліну спрабаваў тлумачыцца:

— Я вельмі ўсхваляваны...

На гэта, народжаны ў Вілейцы, Тадэвуш Канвіцкі кажа:

— Ну дык вы ж так не нервуйцеся. Я ж ваша радня. Я ж таксама неяк беларус.

Праз нейкі час я вярнуўся да свайго (можа гэта ў маім выпадку ў „Чытэльніку” неадпаведнае слова) століка. Перада мною ўпэўнена сядзеў малады чалавек у адзідасах, а разам з ім — мужчына гадоў пад пяцьдзесят. На твары таго было відаць цяжкую долю польскага земляроба, быццам бы мала падыходзячую да вісеўшых над ім здымкаў наведвальнікаў гэтага месца: прафесара Владыслава Барташэўскага, рэжысёра Рамана Палянскага, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Чэслава Мілаша... Паколькі „мой” столік быў вельмі ж блізка да іхняга, хоцькі-няхоцькі чуў я, пра што яны гавораць. Было аб крэдытах, капіталаўкладаннях, арэндах і да г.п. Дайшо да мяне, што старэйшы з мужчын з’яўляецца дэпутатам Сейма, які знаходзіцца пры той самай вуліцы Вейскай, што і „Чытэльнік”. Як адзіны ў рэстаране мужчына паклаў на стале мабільны тэлефон. Апарат званіў штохвіліны. Да таго азываўся ён страшэнна гучным і раздражняльным гукам, бесперапынна перарываючы шэптаныя размовы. Ад гадоў пастаянныя наведвальнікі, асабліва старэйшыя пані — знаўцы і стваральніцы літаратуры пасля кожнага такога гуку моўчкі, спакойна, амаль велічна адварочвалі галовы ў бок століка дэпутата, быццам бы хацелі паддаць уласніка мабільніка гіпнозу. На нішто гэта не здалося.

Пасля я падаўся на месца дамоўленай раней сустрэчы. На Новым Свеце якісь мужчына ўручыў мне лістоўку з запрашэннем на вячэрняе спатканне-вечарыну, „прысвечаную каханню і міласэрнасці”. Прачытаў я, што мяне там чакалі б: алегарычныя інтэрпрэтацыі „Песні над песнямі” Саламона, якія вялі б Амбасадар Міру Ежы Альшэўскі і пані Альжбета Шаг — сакратар Мусульманскага канфесійнага таварыства, якая мела б прадставіць версеты Карана аб любові ў сям’і. На канцы лістоўкі арганізатар, бліжэй невядомая мне Універсальная федэрацыя любові запрашала на Тлусты чацвер. „Песнь над песнямі”, Каран, Тлусты чацвер — зашмат у адным, прынамсі для мяне — падумаў я.

Я вярнуўся на канец у Беласток. Заглянуў у апошні нумар „Нівы”. Тут прачытаў ліст Пасольства Беларусі, які тычыўся аднаго з маіх фельетонаў, у якім пісаў я аб указаннях кіраўніка польскага МЗС Анны Фатыгі наконт утрымлівання адносін польскіх чыноўнікаў з беларускімі. Я ніяк не пісаў аб перыядзе 2003-2004 гг. У лісце пасольства пры нагодзе намякалася, што я з’яўляюся польскім аўтарам, з націскам на слова „польскім”. Спяшаю, аднак, высветліць, што сам факт публікавання мною тэкстаў у „Ніве” хай сведчыць аб тым, што маё пачуццё нацыянальнай прыналежнасці не з’яўляецца такім, якім хацела б яго бачыць Пасольства Беларусі і да таго яно — мая асабістая справа ды не можа быць аргументам у якім-небудзь дыялогу.

Ergo. Як на апошні час, зашмат вакол мяне недарэчнасцей.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Размова з Янушам Корбелем з'яўляецца добрай нагодай да дыскусіі на тэму новага праекта аховы Белавежскай пушчы. Просім дасылаць свае заўвагі ў Рэдакцыю ...

Як ахоўваць Белавежскую пушчу?

Размова з ЯНУШАМ КОРБЕЛЕМ з Белавежы — адным з ініцыятараў стварэння новага праекта аховы Белавежскай пушчы і актыўным удзельнікам яго распрацоўкі. Ён — па прафесіі архітэктар, але ад 20 гадоў займаецца дзікай прыродай, піша пра Белавежскую пушчу і фатаграфуе яе.

— Зараз канчаецца распрацоўка новага праекта па стварэнні на ўсёй тэрыторыі Белавежскай пушчы нацыянальнага парку. Вы былі адным з ініцыятараў новай задумы.

— Задума гэтая ўзнікла ў пачатку 2006 года, калі я спаткаўся з музыкам Зміцерам Войцюшкевічам (Тодарам), антраполагам культуры, амерыканкай Юніс Блаваскунас і іспанкай Нурыяй Сельва, якая 7 гадоў працавала ў Белавежскай пушчы. У міжнароднай кампаніі мы вырашылі, што новаабранага прэзідэнта РП Леха Качынскага трэба зацікавіць новымі прапановамі па ахове прыроды і мясцовай культуры ў Белавежскай пушчы і яе наваколлі. Па Інтэрнэце звярнуліся мы з заклікам да людзей ва ўсім свеце, каб 3 сакавіка прызнаць Днём салідарнасці з Белавежскай пушчай. Людзі з розных краін свету даслалі нашаму прэзідэнту каля дзесяці тысяч лістоў з прапановамі лепшай аховы Белавежскай пушчы, а 3 сакавіка 2006 года перад польскімі амбасадамі ў дваццаці краінах свету наладжаны былі маніфестацыі ў падтрымку аховы пушчы, у ходзе якіх перадаваліся петыцыі польскім дыпламатам. Таксама 3 сакавіка дэлегацыю прыняў прэзідэнт РП Лех Качынскі і вырашыў падтрымаць ідэю распрацоўкі новага праекта для Белавежскай пушчы. Гэта ўжо Канцылярыя прэзідэнта РП стварыла рабочую групу для распрацоўкі законапраектаў па ахове спадчыны прыроды і культуры рэгіёна Белавежскай пушчы.

— Хто ўвайшоў у гэтую групу?

— Група налічвае 18 чалавек. Пераважна гэта навуковыя работнікі, галоўным чынам белавежскіх навуковых устаноў, сярод якіх было двух навукоўцаў з Дзяржаўных лясоў. Група стваралася перад самаўрадавымі выбарамі і таму ў яе складзе апынуўся толькі адзін прадстаўнік самаўрадаў, у асобе славутага сёння намесніка маршалка Падляшскага ваяводства Кшыштафа Талвінскага. Апрача прыродазнаўцаў і леснікоў, у склад групы ўвайшлі таксама выдатныя прафесары права Марк Гурскі і Тамаш Жыліч, географ і грамадскі дзеяч Міраслаў Сцепанюк, Сцяпан Якімюк з Сусветнага фонду ў карысць прыроды (WWF) і я. Людзей падабралі працаўнікі прэзідэнцкай канцылярыі. За паўгода стварылі мы тры законапраекты, якія ў снежні 2006 года перадалі мы ў прэзідэнцкую канцылярыю для юрыдычнай распрацоўкі. Да канца студзеня 2007 года прэзідэнцкія эксперты мелі апрацаваныя законапраекты вынесці на грамадскае абмеркванне.

— Прадстаўнікі мясцовых самаўрадаў незадаволеныя Вашым праектам і ў паразуменні з прадстаўнікамі Дзяржаўных лясоў апрацоўваюць свой праект.

— Ведаю я толькі аб прапановах наконт стварэння ў Белавежскай пушчы новай формулы аховы ў рамках Нацыянальнага лесу, які знаходзіўся б на тэрыторыі Дзяржаўных лясоў. Прадставілі ўжо іх самаўрадаўцы, але ў гэтай галіне не распрацаваны канкрэтныя законапраекты, ёсць толькі лозунгі для дыскусіі. Прэзідэнцкая канцылярыя запрасіла прыпушчанскіх войтаў і гайнаўскага старосту, каб даведацца пра іх стаўленне да новага праекта аховы Белавежскай пушчы. Прадстаўнікі самаўрадаў заяўлялі, што патрэбныя ім сродкі на будову інфраструктуры, галоўным чынам дарог і каналізацыі. Можна было патрабаваць больш, хаця б на захаванне мясцовай культуры.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— Як Вы разумееце тэрмін мясцовая культура?

— Сёння тэрмін мясцовая культура ў галоўным тычыцца беларускай культуры. Аднак жылі тут раней жыды, а сёння жывуць таксама палякі ці ўкраінцы. Шкада, што навуковыя работнікі, якія распрацоўвалі праект, не разумеюць клімату, які ствараюць мясцовыя жыхары і не заўважаюць прыгажосці прыпушчанскіх вёсак. Для іх прыпушчанская культура гэта часта жыццё колішніх пушчанскіх асочнікаў ці каралеўскія паляванні.

— Што Вы прапанавалі ў гэтай справе, працуючы ў рабочай групе?

— Трэба працаваць у напрамку захавання нацыянальнай тоеснасці і духовай культуры людзей пражываючых у наваколлі Белавежскай пушчы, збяражэння мясцовых дыялектаў, песень і веравызнанняў нашага насельніцтва.

— Многія людзі, якія жывуць у Белавежскай пушчы і яе наваколлі лічаць, што зараз яе ахова дастатковая і новыя прапановы непатрэбныя.

— Нацыянальны парк у Белавежскай пушчы і так пашыраць, а пры нагодзе павелічэння парку трэба выйграць як найбольш для мясцовага насельніцтва. Пры распрацаваным намі праекце такая магчымасць паяўляецца. Зараз добрая кан'юнктура для продажу драўніны і таму фінансавы баланс дзейнасці Дзяржаўных лясоў задавальняючы. Аднак усё можа памяняцца і тады ў рамках Дзяржаўных лясоў цяжка будзе знайсці сродкі на нагляд за Белавежскай пушчай, а на дзейнасць нацыянальнага парку мусяць знайсціся грошы з дзяржаўнага бюджэту. У кожнага нацыянальнага парку ёсць свая марка, якая прыцягвае турыстаў. Зараз амаль усе турысты едуць глядзець на пушчу ў Белавежскі нацыянальны парк, а не, напрыклад, у наваколле Гайнаўкі або Дубіч-Царкоўных, бо там няма нацыянальнага парку. Белавежскі нацыянальны парк за апошні год наведала каля 240 тысяч турыстаў, якія пакінулі тут свае грошы. Цяпер у Белавежскай пушчы чатырох гаспадароў — тры надлясніцтвы і Белавежскі нацыянальны парк. Калі на ўсёй тэрыторыі пушчы будзе нацыянальны парк, можна будзе кіраваць ёю комплексна і выступаць за большымі сродкамі на прыпушчанскія інвестыцыі, хаця б на развіццё турызму, які можа даць новыя месцы працы для мясцовага насельніцтва.

- Людзі, якія працуюць на невялікіх дрэваапрацоўчых прадпрыемствах Гайнаўкі і наваколля, лясныя работнікі з-па-за парку і многа іншых асоб апасаюцца, што ва ўмовах нацыянальнага парку, пашыранага на ўсю тэрыторыю Белавежскай пушчы, могуць застацца без працы.

— У прапанаваным намі праекце прадбачваецца забеспячэнне невялікіх дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў драўнінай, а ўсе лясныя работнікі Дзяржаўных лясоў змогуць знайсці работу ў нацыянальным парку. Аднак супраціў работнікаў Дзяржаўных лясоў да ідэі пашырэння нацыянальнага парку можна ў вялікай ступені тлумачыць паніжэннем іх зарплат. Зараз сярэднія месячныя заробкі ў трох пушчанскіх надлясніцтвах крыху перавышаюць чатыры тысячы злотых на душу, а працаўнікі нацыянальнага парку ў сярэднім зарабляюць нават менш чым дзве тысячы злотых. Мы прапанавалі павысіць зарплаты ў нацыянальным парку, але яны, зразумела, не будуць такімі высокімі як зараз у Дзяржаўных лясах. У новым праекце прапануецца таксама, што самаўрады будуць атрымліваць лясны падатак і ад лясоў, уваходзячых у склад Нацыянальнага парку Белавежскай пушчы, бо так прапануецца называць нацыянальны парк.

— Усё ж такі супраць Вашых прапаноў выступаюць мясцовыя самаўрадаўцы і работнікі Дзяржаўных лясоў. Нядаўна збіраліся подпісы пад петыцыяй супраць прапановам пашырэння Нацыянальнага парку на тэрыторыю ўсёй Белавежскай пушчы. Аднак нашы жыхары мала ведаюць супраць якога праекта парку пратэстуюць.

— У нацыянальным парку, пашыраным на ўсю тэрыторыю Белавежскай пушчы, прапануецца выдзеліць чатыры тэрыторыі з розным рэжымам аховы лесу і яго дзікіх жыхароў. Прадбачваецца, што тэрыторыя поўнай аховы пушчы зойме 21% ад усяго ляснога абшару, 48,5% тэрыторыі прапануем выдзеліць на інтэграваную ахову, гэта значыць на патрэбы турыстаў. Не будзе ўжо там праводзіцца гаспадарчая прадукцыя драўніны, толькі будуць выдзелены дарогі для пешаходаў, веласіпедаў ці брычак. Пад актыўную ахову пушчы плануецца адвесці 29% яе тэрыторыі. Прадбачваецца, што там будзе адбывацца перабудова лесу меншай вартасці і на працягу года можна будзе там высечы 25-30 тысяч кубаметраў драўніны на патрэбы мясцовых дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў і апал. Плануем поўнасцю забяспечыць патрэбы мясцовага насельніцтва і спыніць вываз драўніны на патрэбы дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў у Польшчы, бо апошнім часам праводзілася высечка размерам каля 140 тысяч кубаметраў у год. Мы хочам каб у будучыні замест драўніны турыстам прадавалася прыгажосць нашай пушчы. На ўсю тэрыторыю Белавежскай пушчы, апрача тэрыторыі поўнай аховы, людзям можна будзе ўваходзіць і збіраць там грыбы, ягады, маліны ці іншыя дабрадзействы лесу. Так, што людзям даступнай будзе большая тэрыторыя, чым цяпер. Плануецца, што чацвёртая частка пушчы будзе займаць толькі 1,5% плошчы і будзе называцца тэрыторыяй аховы краявіду. Там знаходзіліся б цікавыя архітэктурныя помнікі і аб'екты культуры, такія напрыклад як асяродак „Ягелонскае". Побач лясоў хочам стварыць прыпушчанскую „атуліну", у якую не ўвойдуць дамы ў спалучанай забудове. Гэтая „атуліна" абмінае ўсе будаўнічыя тэрыторыі. Аднак нашы прапановы ў канчатковай распрацоўцы могуць яшчэ крыху памяняцца.

— Ці прадбачваецца канкрэтная фінансавая ўспамога мясцовага грамадства?

— Плануецца ўспамога для мясцовага насельніцтва памерам у 280 мільёнаў злотых, з чаго 55 мільёнаў было б выдзеленых з дзяржаўнага бюджэту. Грошы гэтыя выдаткоўваны былі б на разбудову мясцовай інфраструктуры, гэта значыць, на будову дарог ці каналізацыі. Сродкі былі б таксама на адукацыю мясцовага насельніцтва ў галіне аховы прыроды і прыстасавання людзей да прымання турыстаў. Грошы выдзелены былі б таксама на развіццё турызму і захаванне культурнай спадчыны. Можна было б ладзіць культурныя мерапрыемствы ці рэалізаваць іншыя прапановы па захаванні нацыянальнай тоеснасці прыпушчанскага насельніцтва. Аднак трэба было б яшчэ пазмагацца за сродкі на прапановы ў галіне культуры.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Клопаты...

У студзені г.г. па прычыне дрэннай дарогі спынілі курсіраванне аўтобусаў ПКС праз вёску Давідавічы, што ў Заблудаўскай гміне. Падняўся тады вялікі шум у гміне ды не толькі! Беластоцкае тэлебачанне ў „Аб'ектыве" паказала, як людзі ў Давідавічах ездзяць на веласіпедах, ды як солтыс на сваёй машыне возіць людзей да лекара. Выказваліся ў гэтай справе кіраўнік транспарту Аддзела ПКС у Беластоку Ежы Андрайчук і намеснік бурмістра заблудаўскай гміны Міраслаў Максімюк, абяцаючы хуткі рамонт дарогі. Нават у першай праграме тэлебачання ў 19.30 паказалі як жывуць людзі на Падляшшы ў пачатку XXI стагоддзя, як гразнуць яны ў балоце, дабіраючыся ў заблудаўскую гміну ці да лекара.

Калі спынілася курсіраванне двух аўтобусаў на трасе Беласток — Гайнаўка і ў адваротным напрамку, так што жыхары вёсак Іванкі-Рагазы, Агароднікі, Бялкі, Сакі, Гозьная і Каўпакі не маюць на чым дабрацца ў Беласток, або да сваіх гмін ці лекара — то ніхто

не адгукнуўся. Такая ў нас абыякавасць, жывіце бедныя людзі як сабе хочаце, вы нам патрэбны толькі на выбары, каб аддаць свае галасы на гмінных радных. Пісаў я аб гэтым ужо не раз, ездзіў да дырэкцыі ПКС у Беластоку, таксама ездзіла ад нас дэлегацыя вяскоўцаў у Маршалкоўскую ўправу ў Беласток. На жаль, аўтобуса як не было, так і надалей няма. Нам планаваць новых курсаў няма патрэбы, хопіць толькі ў 6.30 з раніцы павярнуць аўтобус з Нарвы праз вышэйзгаданыя вёскі. Падобна можна зрабіць пасля абеду — аўтобус, які выязджае з Беластока ў 14.55 павярнуць у Трасцянцы праз гэтыя вёскі. І ўсё было б добра. Жыхары гэтых шасці вёсак былі б вельмі задаволены ды ўдзячны ўладам за тое, што бесперашкодна маглі б дабірацца да лекара, у гміну, павет і ваяводства. Дапамажыце нам!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Зберагчы памяткі

У Нараўцы 24 сакавіка г.г. будзе адкрыта Галерэя імя Тамары Саланевіч. Адзін пакой будзе прызначаны рэгіянальным колішнім прадметам хатняга ўжытку на вёсцы, сельскагаспадарчым прыладам і г.д.

У Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы прымаюць такія прадметы. Можна патэлефанаваць за дэталёвай інфармацыяй пад нумар 085 685 80 34 у ГАК, або пад нумар 085 682 98 80 у Гмінную ўстанову ў Нараўцы. **(мох)**

Добра нам жывецца (2)

Апошнім часам апісалі мы стан маёмасці самаўраднікаў, засядаючых у Падляшскім сеймику і беластоцкай Гарадской радзе, а якія выводзяцца з беларускага асяроддзя. У гэты раз прадстаўляем маёмасць выбраных старостаў, бурмістраў і войтаў з тэрыторый, дзе ў большасці жыве беларуская меншасць.

Падобна як і ў папярэдніх заявах, таксама ў выпадку тэрытарыяльнай выканаўчай улады, у рашучай большасці было адзначана, што маёмасць, якія знаходзіцца ў іх валоданні, гэта сужэнская маёмасная ўласнасць. Прыбыткі падаваліся ў сумах брута, у іншых выпадках нета, а яшчэ ў іншых увогуле не памячалася, ці тыя квоты атрымліваюцца „на руку", ці гэта заробкі без адліку падатку. Большасць старостаў, бурмістраў і войтаў прызнавалася да сваіх заробкаў за 2005 год.

Кідаецца на вочы факт, што ўсе тут пералічаныя маюць аўтамашыны, але толькі некаторыя выявілі іхнія рынкавыя цэны (не было, аднак, такога абавязку). Без сумнення, да найбольш заможных можна прылічыць бурмістра Сямятыч, якога маёмасць перасягае паўмільёна, падобна як і гарадоцкага войта і бурмістра Кляшчэль, хоць у гэтым апошнім выпадку ягоная задоўжанасць значная, найбольшая сярод пералічаных. Толькі меншым даўжнікам з'яўляецца гайнаўскі староста (у адным з абавязацельстваў разам з сынам). А сярод бяднейшых апынулася хоць бы спадарыня войт Бельскай гміны.

Цікавай з'яўляецца інфармацыя, што ад кіраванай сабою гміны ў торгах дачны ўчастак набыў бурмістр Кляшчэль, а жонкі: войта Дубіч-Царкоўных — будаўнічы ўчастак і Гарадка — ворныя грунты. Хто па-за бурмістрам і гэтымі войтамі ставаў да таргоў, наколькі атракцыйныя гэтыя ўчасткі, як доўга віселі публічныя прапановы, і адказы на падобныя пытанні — гэтага, вядома, у маёмасных заявах немагчыма знайсці. Падобна, дарэчы, як і цяжкай для верыфікацыі з'яўляецца сумленнасць у іх запаўнянні.

Раіна СТЭФАНЧУК

СТАРОСТЫ

Славамір Снарскі (староста бельскі)
— польская валюта: 100 тыс. зл.
— кватэра (51,19 кв. м): 70 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 125 тыс. зл. (староства); Беластоцкая політэхніка: 35 тыс. 318,73 зл.
— аўтамашына „БМВ" (2003 г.); „Дэу" (2000 г.).

Уладзімір Пятрочук (староста гайнаўскі)
— дом (190 кв. м): 150 тыс. зл.
— адпачынкавы ўчастак (975 кв. м) з домікам (45 кв. м): 40 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 89 тыс. 095,24 зл.
— пенсія: 12 тыс. 754,81 зл.
— наглядальная рада: 4 тыс. 520,37 зл.
— аўтамашына „Сузукі" (1999 г.): 15 тыс. зл.
— доўг: 125 тыс. зл.

Ян Залеўскі (староста сямятыцкі)
— польская валюта: 75 тыс. зл.
— кватэра (78 кв. м): 65 тыс. зл.
— участак (629 кв. м): 5 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 105 тыс. 269,10 зл.
— урокі ў школе: 2 тыс. 893,15 зл.
— аўтамашына „Таёта" (1997 г.)

Францішак Будроўскі (староста сакольскі)
— польская валюта: 28 тыс. 623,64 зл.
— дом (50 кв. м): 5 тыс. зл.
— кватэра (62,2 кв. м); кватэра (51,4 кв. м): 170 тыс. зл.
— сельская гаспадарка (больш за 2,3 тыс. га): 100 тыс. зл.
— сельскі ўчастак (11,52 га): вартасць не пададзена
— заробкі ад занятасці: 12 тыс. 676,94 зл.
— аўтамашына „Форд" (1997 г.): 1 тыс. 300 зл.
— доўг (крэдыт на ROR): 8 тыс. 860,86 зл.

БУРМІСТРЫ

Яўген Беразавец (Бельск-Падляшскі)
— польская валюта: 125 тыс. зл.
— замежная валюта: 2 тыс. еўра
— дом (140 кв. м): 100 тыс. зл.
— кватэра (57,80 кв. м): 50 тыс. зл.
— участак (600 кв. м): 20 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 107 тыс. 130,47 зл.
— аўтамашына „Гонда" (1996 г.); „Понтыяк" (1996 г.)

Антоль Ахрыцюк (Гайнаўка)
— польская валюта: 152 тыс. зл.
— замежная валюта: 3 тыс. 400 долараў ЗША
— кватэра (72 кв. м): 72 тыс. зл.; кватэра (70 кв. м)
— гараж: 20 тыс. зл.; гараж: 15 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 118 тыс. 939,20 зл. (2005 г.); 137 тыс. 784,77 зл. (студзень-лістапад 2006 г.).
— аўтамашына „Нісан" (1998 г.); аўтамашына (2004).

Аляксандр Сяліцкі (Кляшчэлі)
— дом (150 кв. м): 100 тыс. зл.
— кватэра (46 кв. м): 100 тыс. зл.
— гаспадарчыя будынкі (350 кв. м.): 250 тыс. зл.
— адпачынкавы ўчастак (0,13 га): 9 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 87 тыс.; найм памяшканняў: 17 тыс. зл.
— аўтамашына: „Гонда" (2006 г.); „Фіат" (2000 г.); „Таёта" (1996 г.)
— доўг: 155 тыс. зл.

Збігнеў Ян Радомскі (Сямятычы)
— польская валюта: 40 тыс. зл.
— замежная валюта: больш за 40 тыс. еўра
— дом (166,5 кв. м): 250 тыс. зл.; дом (120 кв. м): 170 тыс. зл.; дачны дом (107 кв. м): 30 тыс. зл.
— гаспадарка (3,77 га): 15 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 115 тыс. 632 зл.; пенсія: 25 тыс. 817 зл.
— аўтамашына „Таёта" (2001 г.): 30 тыс. зл.

Станіслаў Малахвей (Саколка)
— польская валюта: 14 тыс. зл.
— дом (196 кв. м): 150 тыс. зл.
— гаспадарка (26,16 га): 300 тыс. зл.
— дыета раднага: 7 тыс. 197,20 зл.; правізія солтыса: 972 зл.
— доўг: 20 тыс. зл.

ВОЙТЫ

Раіса Раецкая (Бельск-Падляшскі)
— польская валюта: 2 тыс. зл.
— кватэра (37,20 кв. м): 80 тыс. зл.; кватэра (62,90 кв. м): 60 тыс. зл.
— агульнасельская гаспадарка (3,94 га): 20 тыс. зл.
— гараж (з вечным карыстаннем грунту): 10 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 77 тыс. 217,11 зл.; па нараду: 404,61 зл.; дыета раднай: 7 тыс. 500 зл.; сельскія грунты: 4 тыс. 825,73 зл.
— аўтамашына „Мітсубішы" (1993 г.)
— доўг: 80 тыс. зл.

Міхал Врублеўскі (Чаромха)
— дом (53 кв. м): 60 тыс. зл.
— кватэра (138 кв. м): 140 тыс. зл.
— гаспадарка (3,30 га): 100 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 85 тыс. 113 зл.; гмінная камісія вырашання алкагольных праблем: 132 зл.; з сельскай гаспадаркі: 10 тыс. зл.
— аўтамашына „Рэно" (2003 г.)

Юры Васілюк (Чыжы)
— польская валюта: 31 тыс. зл.
— кватэра (60,34 кв. м): 60 тыс. зл.
— участкі (два агулам 20 кв. метраў; 1/14 з 304 кв. м; 751 кв. м; 733 кв. м): разам 38 тыс. 600 зл.
— заробкі ад занятасці: 78 тыс. 793,69 зл.
аўтамашына „Фіат" (2000 г.); „Таёта" (2003 г.)
— доўг: 22 тыс. зл.

Анатоль Паўлоўскі (Дубічы-Царкоўныя)
— польская валюта: 53 тыс. 288, 57 зл.
— замежная валюта: 118,93 дол. ЗША
— цэнныя паперы: каля 30 тыс. зл.
— акцыі: 5 тыс. 917 зл.
— кватэра (52 кв. м): 40 тыс. зл.
— лясны ўчастак (4,14 га): 30 тыс. зл.
— гараж: 20 тыс. зл.
— будаўнічы ўчастак (сужонства: 0,0760 га); не пададзена цана
— заробкі ад занятасці (з оптам на аўтамашыну): 83 тыс. 324,76 зл.
— аўтамашыны: „Опель" (1990 г.); „Фольксваген" (1991 г.)
— доўг: 30 тыс. зл.

Веслаў Кулеша (Гарадок)
— польская валюта: 10 тыс. зл.
— дом з участкам (220 кв. м): 350 тыс. зл.
— кватэра (36,07 кв. м): 120 тыс. зл.
— ворныя грунты (7,28 га): 90 тыс. зл.
— ворныя грунты (сужэнства): дэталі не пададзены
— заробкі ад занятасці (студзень-снежань 2006 г.): 96 тыс. зл. 922,53 зл.; пенсія: 22 тыс. 842,20 зл.

Вольга Рыгаровіч (Гайнаўка)
— польская валюта: 11 тыс. зл.
— дом (54 кв. м): 15 тыс. зл.
— кватэра: (46 кв. м): 30 тыс. зл.; кватэра (61 кв. м): 200 тыс. зл.
— гаспадарка (4,90 га): 20 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 111 тыс. 482 зл.
— аўтамашына „Фіат" (2000 г.)

Марк Назарка (Міхалова)
— польская валюта: 48 тыс. зл.
— цэнныя паперы: 120 тыс. зл.
— дом (80 кв. м): 75 тыс. зл.
— спецыялістычная гаспадарка (13,57 га): 46 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 107 тыс. 420,44 зл.
— аўтамашына „Нісан" (2002 г.): 30 тыс. зл.
— доўг (ROR): 4 тыс. 900 зл.

Якуб Садоўскі (Нарва)
— польская валюта: 28 тыс. зл.
— цэнныя паперы: 39 тыс. 600 зл.
— дом (200 кв. м): 150 тыс. зл.
— сельская гаспадарка (1,09 га): 60 тыс. зл.
— іншыя нерухомасці (1 062 кв. м): 36 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 104 тыс. 061,84 зл.; пенсія: 24 тыс. 288 зл.
— аўтамашына „Сеат" (да 2000 г.)

Мікалай Павільч (Нараўка)
— польская валюта: 62,5 тыс. зл.
— дом (120 кв. м): 140 тыс. зл.
— сельскі ўчастак (1,11 га): 2,5 тыс. зл.
— гаспадарчы будынак (49, кв. м): 15 тыс. зл.
— будаўнічы ўчастак (699 кв. м): цана не пададзена
— заробкі ад занятасці: 105 тыс. 622 зл.; па нараду: 300 зл.
— аўтамашына „Опель" (1999 г.)

Пётр Сэльвесюк (Орля)
— інвестыцыйныя фонды: 42 тыс. зл.
— кватэра (49,40 кв. м): 70 тыс. зл.
— будаўнічы ўчастак (867 кв. м): 25 тыс. зл.
— заробкі ад занятасці: 30 тыс. 157,19 зл.; па дамове на твор: 1 тыс. 200 зл.
— аўтамашына „Форд" (2004 г.)

Дзед Мароз і фабрыка самагонкі

Я заўсёды хацела наведаць Белавежскую пушчу на беларускім баку. На той бок прызывалі старыя дарогі, па якіх нашы продкі дабіраліся ў Камянец, Пружаны, Жыровічы. Цікавасць распальваў ужо сам від лесу, якім завяршаўся далягляд на ўсходзе. Там, недзе сярод дзікага балота, на ўсходзе пушчы, выбівае крыніца ракі Нарвы, а ля яе вытокаў знаходзіцца шлях, па якім калісьці праходзіла звярына з усходніх пушчаў.

Абмежаванне (найбольш псіхічнае) выклікалі фармальнасці, не толькі ў мінулым. Скажу праўду, усе артыкулы пра паездку на беларускі бок пушчы, якія паказаліся ў апошнім часе ў прэсе, толькі знеахвочвалі. Чалавек думае пра тоны дакументаў, пра аплаты, пра рэжым трасы! Аднак варта паехаць на беларускі бок пушчы. Тамтэйшы лес паказаўся мне жывым. Такое ўражанне выклікала процьма звярыны, якая свабодна ходзіць па лесе і не палохаецца чалавека. Ужо ў першы дзень мне пашанцавала пабачыць мо з сорак аленяў і вялікі статак зуброў, які прыйшоў да Памесця беларускага Дзеда Мароза. Дзед Мароз — як паказалася — таксама наш хлопец з Палічнай... Але пра гэта далей...

Мяжу ў Белавежы перасякаю амаль плаўна, я — адзіная пасажырка. Польскі пагранічнік прапануе *па-свойму* агрэцца ў цёплым памяшканні. На двары мароз, а беларускі бок яшчэ не з'явіўся. Іх пагранзастава працуе з васьмі раніцы (па нашым часе). Чакаю з дзесяць хвілін, больш-менш толькі патрэба мне часу, каб запоўніць эміграцыйную картачку ў двух экземплярах. Беларускія пагранічнікі таксама запрашаюць усярэдзіну. Афармленне справы займае пяць хвілін. На беларускі бок, за жалезную браму, пераходжу пад аховай памежніка. На стаянцы чакае ўжо машына. Маладзенькі шафёр завязе мяне проста да Мікалая Бамбізы, дырэктара Нацыянальнага парку „Белавежская пушча". У Камянюкі. На асфальтавай дарозе, якая ўвесь час ідзе праз пушчу, няма руху. Праз акно бачу сляды звярыны на снезе. Недзе за Лядскім возерам ходзіць статак аленяў.

Найбольш эмоцый выклікае гэты першы адрэзак. Праезд праз пушчу тут поўнасцю кантраляваны, дарогі часта перасякаюць шлагбаумы. Турыст можа рухацца толькі па вызначаным шляху. З мяжы турыста падбірае маршрутка або машына. За праезд трэба заплаціць 10 долараў (трыццаць злотых). Калі хто хоча дабірацца на сваім веласіпедзе, раней трэба дамовіцца, па тэлефоне, або па электроннай пошце, з экскурсаводам (усе справы афармляе Турыстычны аддзел пад тэлефонам (01 631) 56-370 і 56-242 або па э-мейлу: <npbpby@rambler.ru>. Інакш, разам з веласіпедам, турыста падбірае аўтобус і вязе ў Камянюкі. Тут уся пушча пад Нацыянальным паркам. Яго тэрыторыя займае 154,5 тысяч квадратных кіламетраў (на польскім баку толькі 11 тысяч). Пушча павялічылася коштам прыпушчанскіх калгасаў, якія далучылі да Парку ўжо за дырэктра Бамбізы. Зараз — гэта гаспадарчая частка лесу.

Камянюкі сустракаю ў прамянях зімовага сонца. Зіхацяць у ім новыя купалы Свята-Мікалаеўскай царквы. Драўляная царква выдатна папраўляе мясціну, зарысоўвае містычны далягляд вёскі. Будуе яе Парк, на месцы старой, разбуранай у часы ваюючага атэізму.

Пад'язджаем пад сядзібу Нацыянальнага парку. Месца напамінае вялікі тартак. Як пасля даведаюся, у планах пабудова новай, асобнай сядзібы. Кабінет дырэктара гэта сціплы пакойчык, ля якога выстойвае чарга. На месцы чакаюць мяне ўжо сяброўкі-журналісткі — Таіса і Аня, з якімі буду ездіць па пушчы і самых вабных турыстычных месцах. А фабрыку самагонкі, якой так моцна зайздросцяць па польскім баку, пакажа асабіста Мікола Бамбіза. З першага слова знаходзім супольную мову: дырэктар Белавежскага Нацыянальнага парку — шчыры беларус і абаронца прыроды.

(працяг будзе)

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Спадзяванні пенсіянераў

Не будзе сяголета пераацэнкі пенсій. Урад рашыў, што лепш даць аднаразова больш, чым штомесячна прыбаўляць па некалькі злотых да пенсій. Паводле прынятага закону ў красавіку г.г. будзе выплачаны аднаразовы дадатак. Гэтым законам пакарыстаецца шэсць з паловай мільёна пенсіянераў, якіх месячная плата не перавышае 1 200 злотых. Тычыцца гэта і тых, хто карыстаецца сацыяльнай дапамогай або атрымлівае дапенсійную дапамогу. Аднаразовы дадатак залежны будзе ад велічыні пенсіі. І так: у каго яна не большая чым 600 зл., дык атрымае 330 зл. дадатку, затым адпаведна: ад стаўкі 800-1000 зл. — 180 зл. Найменш атрымаюць — па 150 зл. — тыя, у каго пенсія ад 1 000 па 1 200 зл. Абагульняючы вышэйсказанае трэба прызнаць, што пенсіянераў абдурылі. Не будзе закону аб ліквідацыі „старога партфеля", што абяцалі палітыкі. На чарговыя такога тыпу абяцанні трэба пачакаць да чарговых парламенцкіх выбараў.

У. С.

Па дарозе

Неабходна закончыць перабудову ваяводскай з інтэнсіўным рухам дарогі з Гайнаўкі ў Кляшчэлі на адрэзку Гайнаўка — Елянка. Варта адзначыць, што аднаўленне адрэзка шашы з Елянкі ў Кляшчэлі (яго даўжыня каля 5 кіламетраў) закончылі ў 2003 годзе.

Асфальт на адрэзку дарогі з Гайнаўкі ў Елянку выкрышыўся на краях маставой і ў гэтым вялікая небяспека для карыстальнікаў. Сюдою ездзяць таксама вельмі часта грузавыя аўтамабілі, у тым ліку аўтацыстэрны з небяспечнымі рэчывамі. У 2004-2006 гадах на дарозе з Гайнаўкі ў Елянку здарылася 10 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх загінулі чатыры асобы. Дарогу на гэтым адрэзку трэба пашырыць ды выраўнаць яе абочыны. У аналагічны перыяд на адрэзку шашы з Елянкі ў Кляшчэлі не было аніводнай дарожнай катастрофы.

Абочыны далей

У інфармацыі п.з. „Абочыны ў хмызняку" („Ніва" № 50 ад 10.12.2006 г.) я пісаў пра павятовую асфальтавую дарогу са Старога Ляўкова ў Сушчу што абочыны артэрыі — гэта амаль суцэльная сцяна кустоўя і прыдарожных дрэў. Сям-там кусты „выйшлі" з абочын да самой маставой. Дарога вузкая і з-за таго яшчэ больш небяспечна.

Я выносіў прапанову, каб высечы кусты пры тракце дзеля добрай бачнасці і бяспекі.

Прыйшоў да мяне адказ кіраўніка Павятовага праўлення дарог у Гайнаўцы Тадэвуша Станкевіча, што прыдарожны хмызняк высекуць да 30 сакавіка 2007 года. Пажывём, пабачым — як кажуць старажылы — ці кіраўнік ППД стрымае дадзенае слова, гэтым разам напісанае на паперы ды з фірменнымі пячаткамі.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

ЛАЎРЭАТЫ ЗАЛАТОГА КОНКУРСУ „ЗОРКІ”

14 лютага г.г., у Дзень закаханых, мы наладзілі жараб'ёўку з удзелам дзетак з беларускага прадшколля ў Беластоку. Іх рукамі былі назначаны лаўрэаты „Залатога конкурсу”, аб'яўленага „Зоркай” 31 снежня 2006 года.

Прыгадайма, што „Залаты конкурс” мы наладзілі ў сувязі са святкаваннем залатога юбілею нашай рэдакцыі. Нам — 50 год!

А вось правільныя адказы:

1. Які беларускі паэт з 1957 года піша вершы спецыяльна для „Зоркі”?

— Б) **Віктар Швед.**

2. Хто з былых журналістаў „Нівы” на працягу трыццаці гадоў рэдагаваў „Зорку”?

— В) **Яніна Чэрнякевіч.**

3. Як называецца галоўная гераіня „Мухі ціп-топ”?

— А) **Бася Муха.**

У конкурсе прыняло ўдзел 79 вучняў пачатковых школ і гімназій з усіх куткоў Беласточчыны. Найбольш адказаў даслалі вучні бельскай „тройкі”. Сярод правільных 72 адказаў былі назначаны лаўрэаты і ўзнагароды. Вось і яны.

Лічбавы фотаапарат

Барбара Нядзельская — Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы,

Рафал Тамашук-Спірыдовіч — Гімназія ў Дубінах.

Плэер МР-4

Кацярына Панькоўская — Пачатковая школа н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Моніка Леанюк — Пачатковая школа н-р 3 у Бельску-Падляшскім,

Ніна Ваўранюк — Пачатковая школа н-р 4 у Беластоку.

Энцыклапедыя „Загінулыя цывілізацыі”

Марыя Масальская з Бельска-Падляшскага

Энцыклапедыя „Гісторыя мастацтва”

Уршуля Міхалюк з Чыжоў

Фотаальбом «„Ніва” — час і людзі 1956-2006»

Магдаліна Куптэль — Гімназія н-р 2 у Гайнаўцы, Лідзія Пякарская — Пачатковая школа н-р 4 у Беластоку, Марта Панасюк, Павел Буйнюк, Іахім Вітошка, Анна Гуль, Кшыштаф Парфянюк, Павел Іванюк, Якуб Цымбалюк, Патрыцыя Паплаўская — з Комплекса школ н-р 3 у Бельску-Падляшскім.

Кашулькі са знакам „Зоркі” (паводле праекта Міраслава Здрайкоўскага)

Паўліна Федарук, Паўліна Зінкевіч, Канстанцыя Дораш, Анджаліна Лукашэвіч, Іаанна Нявінская, Кінга Пашко, Філіп Капацкі, Юлія Панютыч, Кшыштаф Пашкоўскі, Эльвіра Плуг, Караліна Навіцкая, Павел Дамброўскі, Сільвія Федарук, Агнешка Шыманская, Аляксандра Семянюк, Ева Галёнка, Караліна Нічыпарук, Каміль Сахарчук, Тамаш Вэнцкі, Гося Дэмянюк, Агнешка Панасюк, Агнешка Швед, Дар'я Ткачук, Марыюш Кандрацюк — усе вучні з Комплекса школ н-р 3 у Бельску-Падляшскім, Ганна Пякарская — Гімназія н-р 7 у Беластоку, Ева Дземянюк, Анна Карчэўская — Пачатковая школа н-р 6 у Гайнаўцы, Іаанна Герасімюк — Гайнаўская беларуская гімназія, Альжбета Антанюк — Гімназія ў Дубінах, Юстына Грыгарук — Гімназія н-р 3 у Гайнаўцы.

Усе ўдзельнікі конкурсу атрымаюць ланцужкі для мабільнікаў са знакам „Зоркі”.

Урачыстае ўручэнне ўзнагарод адбудзецца **3 сакавіка 2007 года ў бельскай „тройцы”, у 12 гадзін.** Запрашаем!

ЗОРКА

Фота Міры Лукшы

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 18 —

Калі я, і мая сяброўка Ганка, даведаліся, што настаўніца мастацтва Ірэна Чарвяк чытае ўсе „валянцінкі” падрыхтаваныя вучнямі, мы моцна ўсхваляваліся. Спадарыня Чарвяк апекавалася школьнай поштай, якую наладзілі ў нашай гімназіі з нагоды Свята закаханых. Гэта была звычайная скрынка, якая стаяла на калідоры. Вучні кідалі ў яе лісты і падарункі сваім сімпатыям і сябрам. Мы з Ганкай таксама купілі падарункі нашым хлопцам: кілаграм цукру Міколку, ваўняныя шкарпэткі Ігару і новую камізэльку Сяргею. Усе падаркі мы палажылі ў скрынку-пошту і з нецярплівасцю чакалі „Валянцінак”. Аднак два дні да свята мы даведаліся, што спадарыня Чарвяк адкрывае ўсе пакеты з падарункамі, а рэчы, якія ёй не падабаюцца, выкідае ў сметніцу. Гэтая навіна вельмі ўзбударажыла моладзь і мы сталі збірацца пісаць ліст-пратэст абаронцу правоў дзіцяці. Каму як каму, а права на прыватную карэспандэнцыю для моладзі вельмі важнае. Як можна чытаць чужыя лісты!? Апрача гэтага Матвейка распусціў плётку, што быццам спадарыня Чарвяк у канцы працоўнага дня забірае скрынку дахаты і там разам са сваёй дачкой выбіраюць сабе найлепшыя падарункі. А тыя, якія не падабаюцца маладой Чарвячанцы, выкідаюць...

Праўда, тое, што расказвае Матвейка, не заўсёды праўда. Але пад уплывам пачутага мы адразу пабеглі да спадарыні Воўк. Дырэктарка не давярала нам і калі мы расказвалі пра свае праблемы, яна іранічна ўсміхалася.

— У вас заўсёды такія дурныя думкі! — крыкнула жанчына. — Як увогуле можна так думаць пра настаўнікаў?! Давайце больш не будзем гаварыць пра такія пусцякі. Лепш падумайце пра свае ацэнкі. Да пабачэння!

Пасля візіту ў кабінеце спадарыні Воўк мы адчувалі сябе прыгнечанымі. Мы ўсё думалі пра спадарыню Чарвяк і яе дачку... Мы ж не куплялі новай камізэлькі для яе! Яна нават не ў змозе скеміць, што гэта жарт. Сяброўскі жарт зразумелы толькі ў нашым класе. Мы таксама памяталі, што ў пачатковай школе ніхто не правяраў нашых „валянцінак”, а тым больш — не аддаваў іх сваёй сям'і.

У Дзень закаханых мы не маглі думаць пра навуку. Усе чакалі пошты. Аднак вучні III класа, якія разносілі „валянцінкі”, прыйшлі ў наш клас ажно на чацвёртым уроку. У мяне і ў Ганкі былі вельмі заклапочаныя міны, калі нашы сябры, Ігар і Сяргей, атрымалі пакецікі. Ігар хіхікаў, Сяргей пайшоў у прыбіральню... А што сталася з пасылкай Міколкі? Праўда, падобны пакет з цукрам мы бачылі ў час доўгага перапынку. Ён стаяў на настаўніцкім стале ў сталовай, а наша апякунка пошты, спадарыня Чарвяк, саладзіла ім сваю каву...

Тэкст:<natasza9922@wp.pl>
Дызайн:<lolcia05@wp.pl>

Аўтары „Зоркі” (справа) Людміла Рублеўская, Міра Лукша, Віктар Швед і Веранічка — дачка спадарыні Людмілы

Вершы Віктара Шведа

Будуць макароны!

Бацька на світанні
Вярнуўся з балявання.
Угледзеў жонку — жах!
З валікам у руках

— Да жонкі ўлюбёнай
Будуць макароны.
А чацвёртай рана
Будзем есць сняданак.

Заквітнела курка!

Юрка з сябрам Маркам
Быў у заапарку.
Пазналі свет гасцінны —
Звярыны і птушыны.

Глядзелі праз хвіліну
на слаўнага паўліна.
— Вось дзіва — кажа Юрка —
Заквітнела курка!

Пазнаем алфавіт

Іголка, іржышча і...

Аднаго разу папрасіў Васілёк маму:

— Навучы мяне пісаць літару „І”.

— Добра, — сказала мама. — Спярша паспрабуй адгадаць загадку. Воўк жалезны, а хвост ільняны. Што гэта?

— Гэта іголка з ніткай, — хуценька адказаў Васілёк.

Мама ўзяла ручку і напісала на аркушы паперы слова „іголка”.

— Яшчэ адну загадку загадай, — папрасіў Васілёк.

— Колькі на небе зорак, столькі на зямлі дзірак. Што гэта?

Думаў Васілёк, думаў і нарэшце дадумаўся:

— Іржышча!

Мама цяпер напісала на аркушы паперы слова „іржышча”. Пасля пытаецца ў Васілька:

— Словы „іголка” і „іржышча” з якой літары пачынаюцца?

З літары „і”.

— Напішы гэтую літару, — прапанавала мама сыну.

Васілёк узяў ручку і старанна вывеў літару „і”. Зірнуў на яе, усміхнуўся:

— Цяпер я не забудуся, як пісаць літару „і”. Я нават магу назваць словы, якія пачынаюцца з гэтай літары: ігліца, імжэць, імператар, інстытут, іней.

(працяг будзе)

Аляксей ЯКІМОВІЧ
„Займальны алфавіт”

Польска-беларуская крыжаванка № 8



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 4: Тэма, эсэ, шар, стары, лектар, грам, но, экран, сак, рамонак, замак, год, на, малы. Рэч, кран, тэлеграма, крама, станок, там, шар, сага, ар, накол, грыбок, ды.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Рафал Скепка, Матэвуш Лапінскі** з Дубін, **Эвеліна Прабуцкая, Юліта Кананюк** з Нарвы, **Наталля Сцепанюк** з Беластока, **Кася Капытка, Аня Каліноўская, Юстына Анішчук** з Чыжоў. Віншуем!

Люба і Уладзімір

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Калі я быў у Янкі Крупы і распытваў яго пра беларускі мастацкі рух, гутарка закранула Уладзіміра Гаўрылюка і Любу Мінько (так у дзявоцтве называлася Люба Гаўрылюк). Рашыў я наведаць іх ды падаўся ў Козлікі. У хаце застаў я толькі спадарыню Любу; спадар Уладзімір у той час паехаў у Заблудаў на медыцынскія працэдуры.

Люба Гаўрылюк заўсёды занята нейкай работай. І зараз яна вышывае харугвы для нядаўна згарэлай царквы ў Каманчы; гэта яе ахвяраванне духовай справе, патрэбе душы, патрэбе чалавечага сэрца. Задзівіла мяне моцна, што спадарыня Люба Гаўрылюк карыстаецца вялікай лупай заміж акулярамі...

— Не магу насіць акуляраў — прызналася мне. — Зараз пачынаюць балець вочы, дакучаць галава. Мабыць гэта след той нядолі, якой давялося зазнаць у дзяцінстве, пад акупацыяй...

Люба Гаўрылюк нарадзілася ў верасні 1942 года. У 1944 годзе, тыдзень пасля Пятра, адступаючыя немцы спалілі прысёлак Ставок каля Трасцянкі, дзе ў той час жыла сям'я Мінько.

— Немец спаліў усё, нават драўніну, — расказвае спадарыня Люба, — што была назапашана на новую хату. Як ратаваліся, мама папрасіла суседа, каб дзіцячы ложак прыхапіў, а немец той ложак выхапіў суседу, абліў гаручым і таксама спаліў. Давялося жыць у зямлянцы. Не было чаго есці, не было малака, толькі кава з сахарынай. Завяліся паразіты, мне сталі валасы выпадаць, ногці... Бацькі злякаліся, што я ўжо так занядужала, што і не выйду з гэтага. Мабыць дзеля таго, каб не глядзець майго гібення ў 1945 годзе аддалі мяне мамінай сястры, што ў Ласінцы жыла. А цётка зараз пабегла па суседзях распытваць як лячыць маю немач. І людзі падказалі, цётка стала купаць мяне ў параных пшанічных атрубах і я стала акрыйваць. Праз два месяцы вярнулася я да бацькоў. Яны ўжо ўпрасілі бацюшку Мікалая Стракоўскага, каб прыняў нас на плябанію. І ён прыняў. Апрача бацюшкавай сям'і і нас на плябаніі жылі яшчэ каталіцкія сем'і, якіх будынкі былі спалены разам з нашымі. У той час у нашай сям'і было сямёра дзяцей — пяць дзяўчат і двух хлопцаў. Пасля нашы паставілі хлеў, а ў ім выдзелілі сабе адзін „пакойчык". Хату паставілі ў 1956 годзе.

У школу хадзіла я ў Трасцянку. У Трасцянцы вучыліся таксама дзеці з Янова і Качалаў. Калі разлівала Нарва, тых дзяцей вазілі лодкамі.

Пасля школы я каля года аставалася дома, а пазней паступіла на культурна-асветныя курсы ў Супраслі. Атрымаўшы там адукацыю бібліятэкара і культработніка, вярнулася ў родную вёску і ў 1959 годзе стала на працу ў Публічную бібліятэку ў Трасцянцы. Бібліятэкаркай працавала сама адна. Тады быў у бібліятэцы рух — у суткі брала кнігі па шэсцьдзесят чытачоў! Было тады многа моладзі, вёска была вялікая. Ды і старэйшыя ахвотна чыталі, асабліва рускія кніжкі, якіх тады было многа; пасля Уладзімір Юзвюк давёз і шмат беларускіх кніжак. Былі такія чытачы, што не маглі хадзіць, то я брала кніжкі ў сумку і насіла ім. Былі яшчэ і бібліятэчныя пункты ў прыватных хатах у Бялках, Сацах і Анцутах, у іх дзяўчаты працавалі на грамадскіх пачатках — бралі ў мяне па 20-50 кніжак і пасля прачытання вярталі іх у Трасцянку. У нашай чытальні былі таксама часопісы; „Работніца і сялянка", „Крестьянка". Усе нумары „Нівы" былі сшыты. Аднойчы ў Трасцянцы наладзілі забаву за білетамі і прыход ад гэтага мерапрыемства прызначылі на куплю гульняў, м.інш. шахмат. Лічу, што бібліятэку я вяла добра, бо калі на Гайнаўшчыну прыязджалі нейкія госці, іх прывозілі ў Трасцянку паказваць нашу ўстанову.

Недзе ў 1957-58 годзе ў Трасцянку прыехаў Жорж Панько і заснаваў у нас вакальны калектыў. І я ў ім спявала, з перапынкам на Супрасль. Той калектыў праіснаваў мо тры гады і Панько адмовіўся ад працы з ім; у яго была вельмі раўнівая жонка, якая ўвесь час усчынала авантуры, падазраваючы яго ў сімпатыях да харыстак. Пасля курсаў у Супраслі я стала весці вакальны калектыў. Моладзь прыходзіла ахвотна на заняткі, аднак не ўсе маглі спяваць, не ўсе ж маюць патрэбны голас. Дзеля іх арганізавала я драмгурток. З драмгуртком вельмі многа на грамадскіх пачатках працавала настаўніца Савіцкая. Яна прапанавала свае п'есы, бралі таксама п'есы з бібліятэкі, з „Нівы".

У 1962 годзе выйшла я замуж, за аднавяскоўца Валодзю Гаўрылюка. Я ў школьны час вельмі дружыла з ягонай сястрой, усюды з ёй хадзіла, можна сказаць, што ў іх хаце выводзілася. Ён у 1959 годзе з войска вярнуўся і адразу ў Беласток падаўся на працу. Там займаўся ў танцавальным гуртку, што Гіжэўская з Крупам вялі; танцаваў ён там да вяселля. Да таго часу ён наймаў кватэру ў Беластоку, але яшчэ зараз пасля вяртання з войска ён запісаўся на сваю кватэру. Год пасля вяселля мы тую кватэру атрымалі, а да таго часу я жыла ў сябе, у Стаўку, пакінула працу ў бібліятэцы, а ён жыў у Беластоку. У 1964 годзе нарадзілася ў нас Аля, у 1966 годзе Бася і ў 1971 — Янка.

У 1959 годзе арганізавалася „Лявоніха", я была ў ліку кандыдатаў у эстраду, але не было дзе ў Беластоку зачапіцца. Калі я яшчэ працавала ў бібліятэцы, Беларускае грамадска-культурнае таварыства арганізавала вакальныя двухтыднёвыя курсы ў Супраслі. Міхаіл Ануфрыеў, які навучаў спеваў, паслухаў мяне і адразу кажа: Я вас у „Лявоніху" прымаю! Калі б мо была тады яго папрасіла, то можа ён і знайшоў бы мне якую кватэру ў Беластоку. Але і так для „Лявоніхі" я сукенкі вышывала: Любе Томчык, Ніне Свентахоўскай, Валі Сянкевіч.

Фота Міры Лукшы

Люба Гаўрылюк (справа), у дуэце з дачкой Алай на сёлетнім Фестывалі беларускай песні

Пасля сталі ладзіць конкурсы беларускай песні. У 1963 годзе мы з сястрой Жэняй узялі першае месца. Атрымалі ўзнагароду 700 злотаў (а я ў бібліятэцы зарабляла 400 злотаў)! І зноў прапануюць „Лявоніху", але я ўжо з Аляй хадзіла. У 1965 годзе зноў з сястрой бярэм першае месца. І зноў „Лявоніху" мне прапануюць, а я ў той час зноў зацяжарыла — ужо Басю насіла. Пазней, у 1967 і 1968 гадах мы з сястрой, як лаўрэаткі конкурсаў беларускай песні, ездзілі з „Лявонімі", былі ў Саколцы, Чорнай-Беластоцкай, Васількаве, аднак цяжка было зладзіць сямейныя абавязкі з паездкамі. Пазней, ужо разам з Аляй, Сяргей Лукашук забіраў нас з „Васілёчкамі". З 1971 года у конкурсах беларускай песні я ўдзельнічала штогадова, — прадаўжае спадарыня Люба...

Вярнуўся з Заблудава і Уладзімір Гаўрылюк. Адразу прашу каб і ён расказаў пра сябе.

— Вярнуўся з войска, — стаў расказваць спадар Уладзімір, — пайшоў у Беласток, а там траіх сяброў з вёскі намовілі мяне займацца ў танцавальнай групе, да якой яны ўжо раней належалі. У групе былі м.інш. Ян Плева (брат вядомага парламентарыя), Мікалай Астроўка, Вася Панько (сын згаданага раней Жоржа, што ў Трасцянцы вёў вакальны калектыў), Стэфан Селеванчук (брат Чэсі, што танцавала ў „Лявоніхе"). А я танцаваў у пары м.інш. з Оляй Андраюк, якая таксама пайшла ў „Лявоніху". Тады ў Таварыства вельмі многа моладзі прыходзіла, аж сцены трашчалі і будынак той называлі „беларускай амбасадай". Рэпетыцыі адбываліся два разы ў тыдзень, а вялі іх Крупа і Гіжэўская, якая прыязджала з Гданьска.

Спадар Уладзімір Гаўрылюк атрымаў у войску выдатную фізкультурную падрыхтоўку. Яшчэ і дапрызыўніком спрытна хадзіў ён на руках, а ў войску, у Гуры Кальварыі каля Варшавы, ужо практыкаваўся на гімнастычных снарадах; захаваліся здымкі з войска, дзе салдат Гаўрылюк выконвае ручную стойку на брусах! З арміі Уладзімір Гаўрылюк выйшаў з трэцім спартыўным разрадам, які дазваляў трэніраваць спартсменаў.

І зноў бярэ голас Люба Гаўрылюк: — Я за свае спевы з'ездзіла амаль палову Савецкага Саюза! Былі конкурсы савецкай песні, у якіх я ўдзельнічала разам з Аляй, яна выступала на сцэне з дзевяцігадовага ўзросту; некалькі разоў мы сталі прызёрамі. А за прызавыя месцы ўзнагародай былі экскурсіі ў Савецкі Саюз. Маскву наведала я мо пяць або і шэсць разоў. Зведала таксама Ленінград, Тулу, Кіеў, Харкаў, Растоў-на-Доне, Смаленск, Мінск, Ульянаўск, Суздаль, Уладзімір, Яраслаўль, Львоў, Вільню, Рыгу, Леніна, Брэст...

Яшчэ жывучы ў Беластоку заснаўвала „Каласкі" і „Крыніцу", у Козліках „Рэчаньку". Вось і на канец размовы Люба Гаўрылюк збіраецца на рэпетыцыю свайго калектыву. Але яшчэ паказвае вышыўкі харугваў і іконы, якія да іх далучыць.

— Дзе Вы навучыліся шыць харугвы? — пытаю.

— Нідзе. Падгледзела як зроблены гатовыя...

Выходзім з хаты, заўважаю фігуру штучнага бусла ў агародзе...

— А ў мяне і конь з бярозавых вітак ёсць, на зіму схаваны. Я сама яго зрабіла, грыва ў яго з лёну...

Пасля развітання я астаўся ў расеянасці: ці ёсць такая работа, якой бы не ўмела зрабіць Люба Гаўрылюк, вядомая нам першым чынам сваім сардэчным аксамітным голасам.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Гукі Гарадоччыны

Фота Ілоны Карпюк

„Оўвэр Дэй"

Па дарожках

Едучы ад Міхалова відаць палі і залатыя купалы царквы, ад Беластока брукаванай дарогай пад'язджаеш пад запраўку ды гатэль. Гэта два самыя папулярныя краявіды на Гарадоцкай зямлі, яшчэ лес, у далінах, на ўзгорках, пры шашы. Лірычны вобраз штодзённасці мае аднак сваё святочнае аблічча. Пару разоў у год нібыта паломніцтва цягнуцца сотні людзей у таямнічы кусок лесу. Урочышча Борык. Дзіўная Мекка як на цяперашнія часы, асабліва ў Гарадку — царква, касцёл, дом культуры, абмен валюты — ёсць куды падацца, а людзі экалагічна наведваюць лясныя шляхі... і гэта не за грыбамі...

Гуляць бы

Як грыбы пасля дажджу вырастаюць у Гарадку новыя думкі наконт развіцця актыўнасці жыхароў гміны — урочышча, заліў, дом культуры, газета, бракуе яшчэ планаванага драўлянага замка. Каля шасці тысяч патрабавальнікаў культуры кожнай раніцы на працягу апошніх семнаццаці гадоў ідзе на працу, у школу, ведаючы што прыйдзе час адпачынку і гульні, прыйдзе ліпень, а з ім фестываль „Басовішча" ды „Сяброўская бяседа", верасень, што абазначае „Дажынкі" і „Дні Гарадка". Здаецца, гэта шчаслівая гміна... можа і так, але перад усім гэта незвычайнае і чароўнае месца. Доўгая гісторыя гэтай мясцовасці і яе прыгажосць прывяла да заснавання Таварыства сяброў Гарадоцкай зямлі, задачамі якога павінны быць захаванне культурнага багацця і яднанне прыхільнікаў Гарадка. Чамусьці аднак Гарадок вядомы ў свеце перш за ўсё дзякуючы маладым, а як кажа вядомая прымаўка — моладзь будучыняй..., няхай будзе, народа. А народ тут пераважна беларускі, часам тутэйшы, найчасцей беларуска- або свойскамоўны. Такая і моладзь, хаця да польскасці штораз бліжэй, і песень па-польску больш...

З песенькай

Словы з музыкай гэта ўжо характар Гарадка. Музыка плыве па вуліцах не ад учора. Апрача натуральнай прысутнасці фальклорнага калектыву ў галіне музычнай дзейнасці найбольш мяшаюць рок-гурты. На хвалі развіцця фестывалю „Басовішча" ўзнікалі новыя гурты. Вядома, бунтарны характар спрыяў рэакцыі маладых, калі ў польскіх канцэртных залах найгучней іграліі калектывы дыска-пола, з урочышча Борык даходзілі вострыя словы і жорсткія рыфы гітар. Маладым гэта адпавядала. У іх было нешта сваё, дзякуючы чаму маглі ўцячы ў музычны транс, які не патрабаваў электронікі. Можа менавіта шчырасць і чыстасць рок-формы заахвочвала моладзь пачаць гульню з музыкай, некаторых — з мастацтвам.

Добры час

Добры час сустрэў беларускую моладзь у 1990-х гадах. З другога боку прыйшоў і добры час для беларускай культуры. Змены ў Беларусі таксама паспрыялі культуры, перш за ўсё ў сферы беларускай мовы. Маладыя людзі пачалі сябраваць з мовай сваіх продкаў, выходзячы з бацькоўскай хаты на падляшскія сцэны. Яшчэ ў 1990-х гадах асяроддкаў „беларускай музыкі" было намнога больш, але да сёння захаваўся толькі Гарадок, часам толькі зрэдку здарыцца нейкі зрыў у Беластоку ці Гайнаўцы. Гарадок мае сваю мікраатмасферу, якая паўплывала як на развіццё культуры, так і людзей, якім гэтае месца неабыякавае. Вядома, упершыню гэта аўтахтоны, звязаныя эмацыянальна, сярод іх мастак „ад карцінаў". Але дзе яму да музыкі..?

Сіла ўяўлення

Андрэй подушкамі сцішаў гук бубнаў, каб не перашкаджаць, Бартэк два гады іграў у клуні. Сіла рашучасці? Не было б гэтага каб не піянерская дзейнасць, каб не было „Брагі". Музыкі „Рімы" ці „5сот5", без хвіліны роздуму расказваюць пра часы, калі „Брага" паказвала, куды ісці, чым варта заняцца. „Басовішча"? Зразумела, але маладых фармуе асяроддзе. „Каб старэйшыя сябры не браліся за гітары, не было б такіх канцэртаў сёння", — кажа мне Марк, бас-гітарыст, яшчэ перад канцэртам „Раазам" , які адбыўся чарговы раз у Гарадоцкім асяродку культуры ў мінулую пятніцу. „Мы напэўна не займаліся б музыкай у такой мясцовасці, не ведаючы, што мае гэта сэнс, што можам працай многае дасягнуць і, самае важнае, што можам адкрыць у сабе нейкі талент", — даказвае мой суразмоўца.

Многа нас

У рэпетыцыйнай кропцы, адкуль добра відаць сцэну, натоўп людзей, музыканты, іхнія дзяўчыны, жонкі, мноства сяброў, поўня жыцця, натуральнасць сітуацыі аж здзіўляе. Пытаю чаму такія канцэрты надалей арганізуюцца, каму і адкуль гэта ўзялося? Хлопцы смяюцца... „Усё пайшло ад Лёніка! Без яго, без гурту «Р.Ф. Брага» я ніколі не меў бы адвагі займацца музыкай", — адказвае Бартэк, карыстаючыся нават словам „аўтарытэты". Моладзь кранае мастацтва, але і традыцыя ў нейкім сэнсе адначасова падтрымлівае стан бунтарства.

Першым на сцэне выступіў маладзенькі гурт „Оўвэр Дэй", чарговая надзея..? Не чула я слоў на беларускай мове, якая акрэслівае спецыфіку гарадоцкай рок-сцэны, але гэта магчыма праблема даспявання і фармавання тоеснасці. Гісторыя яшчэ не скончылася...

Ілона КАРПЮК

Можа іншае сонца

У Мінску па вуліцы Першамайскай знаходзяцца мастацкае атэлье, клуб, сталоўка, гатэль, месца сустрэч людзей цікавых жыцця і адкрытых на іншых. Не заўжды пакорлівых. Усё ў адным. Гэта майстэрня Уладзіміра Цэслера. Да нядаўна жыў і ствараў тут Сяргей Войчанка. Сёння няма яго ў жывых. Абодвух яднала неразрыўная мастацкая вязь. Далей іх спалучае. Падпісаныя абодвума мастакамі працы можна ад мінулага тыдня глядзець у варшаўскай галерэі „Зоя".

— Вова гэта такі чалавек, які тое шэрае жыццё ў Беларусі патрапіць паказаць іранічна, — пераконваў у час вернісажу шэф галерэі Дарыюш Жукоўскі, родам з Гарадка.

Аб Уладзіміры Цэслеры яго сябры кажуць:

— Вова гэта самы вясёлы чалавек у Беларусі. Ён такі наш беларускі сцяг.

Перад уручэннем „Ніве" календара з працамі абодвух мастакоў Вова Цэслер падпісваецца на ім таксама за Сяргея. Успамінае пакойнага партнёра:

— Разам з Сяргеем не было і, здаецца, няма такой сферы мастацтва, якой бы мы не займаліся: жывапіс, графіка, дызайн, скульптура, майкі, паштоўкі. Мы пісалі нават фільмавыя сцэнарыі. Генеральна няма большага значэння, якой матэрыяй займаецца мастак.

Дадае:

— Нашы працы гэта пагляд на рэчаіснасць з нашай майстэрні ў Мінску. Можа, там іншае сонца, можа, іншыя пахі. Наша майстэрня ў Мінску гэта наш увесь, замкнёны, свет.

Аб Сяргею Войчанцы:

— Сапраўды, мастакам цяжэй працаваць удваіх. Людзі мастацтва гэта такія індывідуалістычныя субстанцыі. Бывае, што апрача сябе нікога не прызнаюць. Можа, у нас гэтая схільнасць была сцішанай. Каб штосьці ствараць, па-за рамяством, трэба мець галаву. А калі дзве галавы, то і ў размове штосьці нараджаецца, нават у спрэчцы. Цяпер, калі Сяргея ўжо няма, дык я і так ведаю, што ён бы падумаў і найчасцей я далей з ім згодны.

http://www.tsesler.com/

Да вернісажу Уладзімір праводзіць нас па выставе. Паказвае дужманую матрошку-Мону Лізу:

— Калісь я падумаў сабе, што Мона Ліза гэта якраз матрошка. Тым больш, што гады таму разам з „перастройкай" паявіліся матрошкі з ўсялякамі выявамі: Гарбачовым, Брэжневым. У мне яны выклікалі нейкі супраціў.

На адной са сцен галерэі завісла падушка-вышыванка з воблікам культавага фільмавага персанажа Штырліца, героя серыяла „Семнаццаць імгненняў вясны". Цыгарэта ў вуснах, свастыка на гітлераўскім мундзіры:

— Штырліц гэта элемент амаль нацыянальнай культуры, стаў ён быццам бы народным героем. Такімі падушкамі людзі ўпрыгожваюць жыллё.

У гэтым самым памяшканні галерэі, дзе можна паглядзець гэтыя мастацка апрацаваныя аб'екты-прадметы, вісяць карціны (рэльефы з акрылевай пасты і алей на палатне) з цыкла „Машыны". Гэта быццам бы махіны-цягнікі, масіўныя, з мноствам стальных дэталяў ля шасі:

— Мы выдумалі такі від жывапісу ў такой вось тэхніцы. Гэта рэчаіснасць абсалютна віртуальная. Гэтыя працы былі таксама эскізамі для будучых скульптур. Мы хацелі збудаваць чыгуначныя платформы, каб на іх тыя скульптуры ездзілі па Еўропе. Такая выстаўка. Ды тады прыгадалі, што ў Брэсце мяняецца шырыня пуцей, і задуму пакінулі.

У сенях галерэі вісіць некалькі маек з выявай Чэ Гевары, м.інш. з надрукоўкай: *Che-Chnya 1994, Che-rnobyl 1986, Che-khoslovakia 1968*:

— Такіх праектаў-маек мы зрабілі каля 180. Не толькі з Чэ-. Атрымаў я калісьці мабільны тэлефон *Sony Ericsson.* Я ўзіраўся на яго і выдумаў майку *Sorry Ericsson.* Таксама было, калі глядзеў я на *Nescafe.* Як вядома, гэта несапраўдная кава. Адняў я *s* і так узнікла *Niecafe.*

Гумар скрываецца таксама ў малых наклейках-дарожных знаках. На адным з іх відаць забарону ўезду... на вярблюдзе. На іншым: ноты... упісаныя ў чырвонае кола з касой рысай забароны. Некаторыя з запраектаваных знакаў жылі таксама „рэальным" жыццём. Напрыклад, мастакі ў дарозе да млына ў вёсцы Піч непадалёк Мінска паставілі знак забароны хацеўшым сюды прыехаць Дон Кіхотам. Хтосьці пасля той знак знішчыў.

Усе сцены адной з залаў запаўняюць вялікіх памераў вышыванкі: жарты, спасылаючыеся на народную беларуска-рускую лубачную традыцыю ў слоўнай гульні з іх загалоўкамі: „Галівудскія сцэны". Каля кожнай гісторыі выпісана слоўная аповесць быццам старарускай казка.

— Гэта жарты, якія спасылаюцца на старыя драўляныя ілюстраваныя гравюры, якія пераходзілі з рук у рукі.

Працы, асабліва дызайнерскія ці плакаты, не існуюць у Беларусі ў г.зв. публічным абароце. Чаму?

— Гэта пытанне не да мяне, — адказвае Уладзімір Цэслер.

Абодва мастакі ўзнагароджваліся на шматлікіх фестывалях мастацтва, між іншым на славутым на ўвесь свет варшаўскім Біенале мастацтва. Адна з прац змяшчаецца ў французскім Луўры.

Пасля вернісажу выстаўкі адбыўся канцэрт Піта Паўлава, аднаго з легендарных ужо непакорных беларускамоўных музыкаў. Свой канцэрт прысвяціў ён якраз дуэту Цэслер-Войчанка. У некаторых творах на фоне быў чутны голас Уладзіміра, запісаны ў яго мінскай майстэрні.

— Адзінае месца, якое засталося па-за палітыкай, па-за ўсім, куды наша асяроддзе можа прыйсці, прытым яшчэ паесці супу ды напіцца кавы — гэта мастацкае атэлье Вовы.

Раіна СТЭФАНЧУК



http://voranau.com

З'яўленне ў Байнэце новых сайтаў з'ява не зусім ардынарная. Не зусім — бо ў адрозненні ад іншых нацыянальных нэтаў, нараджаюцца беларускамоўныя парталы штодня, на жаль, не сотнямі і нават не дзесяткамі. Таму новы такі сайт выклікае натуральную зацікаўленасць тых, хто жыве падзеямі не толькі рэальнай, але і віртуальнай прасторы.

Адным з такіх нованароджаных сайтаў стала аўтарская старонка Віталя Воранава, які пражывае ў Польшчы, а цяпер штудзіруе ў Чэхіі. Вось як ён піша аб сабе на першай старонцы сайта, робячы гэта чамусьці не ад сябе, а ад трэцяй асобы: «Віталь Воранаў — літаратар, перакладчык, выдавец. Нарадзіўся 18 сакавіка 1983 году ў Менску. Сузаснавальнік і старшыня „Беларускага культурна-асветніцкага цэнтру ў Познані" і выдавецтва „Белы Крумкач". Студэнт Унівэрсытэту імя Адама Міцкевіча ў Познані і Заходнячэскага Ўнівэрсытэту у Пльзені. Перакладчык „У чаканьні Гадо" — Сэмюэла Бэкета і „Віня-Пыха" Алана Мілна на беларускую мову. Цяпер жыве ды навучаецца ў Чэхіі». Гэтая самапрэзентацыя мае не толькі беларускую, але і англійскую, польскую, украінскую, чэшскую, рускую і нямецкую версіі.

Першая старонка сайта, выйсці на які можна, набраўшы на сваім камп'ютэры адрас http://www.voranau.com, выглядае даволі прывабна і годна маладога літаратара. Праўда, назва якая месціцца над імем і прозвішчам аўтара крыху здзіўляе: „Гняздо, альбо апошняя спроба выратаваць сямейства". Пра якое сямейства ідзе гаворка, і чаму спроба яго выратавання апошняя — на далейшых старонках наўпрост не распавядаецца.

На першай жа старонцы знаходзіцца некаторая колькасць фотаздымкаў аўтара і выйсці на іншыя рубрыкі. На жаль, некаторыя з іх пакуль не працуюць. Але згодна сваёй „птушынай" тэматыцы Віталь Воранаў указвае, што „разьдзел паляцеў у вырай, але хутка вернецца".

У наступных рубрыках сайта мы знойдзем творы літаратара. Так, старонка „Крылы" змяшчае ў сабе ягоную прозу. „Сцены", „Дзядзька Мікола" і „Цётка" пазнаёмяць віртуальнага наведвальніка са светапоглядам Віталя Воранава. Калі прачытаць гэтыя аповесці, то мімаволі знаходзіш нешта агульнае з творчасцю беларускіх пісьменнікаў Беласточчыны.

Сваю паэзію Віталь прадставіў чамусьці толькі адным вершам. Называецца ён „Жанчыны мае" і ёсць белым, гэта значыць у ім адсутнічае рыфма. Рубрыка, дзе ён месціцца носіць назву „Пер'е".

Нацэлены малады літаратар і на драматургію, якая мусіць быць на старонцы „Хвост". Чаму аўтар залічыў гэтую галіну мастацтва да чагосьці апошняга (бо як іначай зразумець назву рубрыкі?) на даны момант застаецца загадкай.

„Дзюбы і кіпцюры" — старонка, дзе літаратар прадставіў усяму свету сваё эсэ. Называецца яно проста і жыццесцвярджальна — „Я веру". Філасафічны характар твора дазваляе разам з аўтарам задумацца над рознымі бакамі жыцця і мастацтва. „Я веру, — піша Віталь, — што мастацтва гэта свайго роду лек, які прыняты ў адпаведнай дозе лечыць, а пададзены празьмеру забівае. Мастацтва гэта панацэя і атрута. А мастак ва ўсім гэтым зусім ня знахар і ня лекар, а сьмяротна хворы фармаколяг".

Рубрыка „Алей і іншы корм" — свайго роду мастацкая галерэя, дзе літаратар і мастак размясціў свае малюнкі. Паколькі ў кожнага свой густ, ацэньваць даныя творы можна па-рознаму.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Для каго гуляюць?

Пра стан развіцця таго ці іншага віду спорту ў краіне часта найлепей сведчыць нацыянальнае першынство, бо зборныя — гэта толькі вяршыня айсберга. І часам, калі задацца мэтай, можна стварыць прыстойную нацыянальную дружыну. Але, калі не збудаваць трывалай піраміды, якая будзе грунтавацца найперш на спартовых дзіцячых школах, сістэме рэгіянальных і агульнанацыянальных рэгулярных спаборніцтваў удзельнікаў рознага ўзросту, добрай перспектывы чакаць не даводзіцца.

Прынцып „моцныя клубы — моцная зборная" пацверджаны дзесяткамі прыкладаў. Далёка іх шукаць не трэба — згадаем хоць бы поспехі польскіх валейбалістаў ці літоўскіх баскетбалістаў. Неблагім узорам можа паслужыць і беларускі хакей, дзе ад пэўнага часу пайшлі шляхам умацавання клубаў і адпаведна чэмпіянату краіны. Спрыяла гэтаму працэсу Усходнееўрапейская хакейная ліга, дзе цягам амаль 10 гадоў спаборнічалі Беларусь, Украіна, Латвія, Літва і Польшча (дзве апошнія нерэгулярна). Ёй на змену прыйшоў адкрыты чэмпіянат Беларусі, ровень якога спакваля рос. І хоць бальшыня дзіцячых каманд існуе ў досыць бедным стане, але дзяржаўны прыярытэт хакею даваў пэўны плён. Пра гэта выразна засведчылі больш-менш рэгулярныя поспехі нацыянальнай зборнай і клубаў у Кантынентальным кубку. Вельмі цікава праходзіць і бягучы чэмпіянат. Наперадзе захапляльны па сваёй непрадказальнасці плэй-оф. Але хмары, якія згушчаліся над клубамі з традыцыямі — мінскімі „Дынама" і „Юнацтва", „праліліся" — клубы аб'яднаюць (добра яшчэ, што застанецца „Керамін"). Новы гібрыд будзе ўдзельнічаць у непатрэбным беларусам 2-ім дывізіёне чэмпіянату Расіі, а роднае першынство збяднее.

Сумным прыкладам занядбання з'яўляецца гаротны стан айчыннага мужчынскага баскетбола. Пасля ашаламляльнай перамогі на чэмпіянаце Еўропы ў 1994 годзе моладзевай зборнай Беларусі мінула нямала часу. За гэты перыяд „залатое пакаленне" было бяздарна страчана — аніводзін (!) баскетбаліст з таго складу так і не зрабіў паспяховай міжнароднай кар'еры. А новую генерацыю талентаў так і не вырасцілі. Зборная боўтаецца ў 2-й лізе, клубы даўно забыліся пра еўракубкі. А вось жаночая баскетбольная дружына заваявала пуцёўку ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы. Поспех быў абумоўлены найперш тым, што баскетбалісткі прайшлі добрую школу Балтыйскай лігі, былі заўважаны селекцыянерамі і выбраны моцнымі замежнымі клубамі.

Ніхто не займаецца папулярызацыяй баскетбола: пра яго не пішуць газеты, не абвяшчаюць афішы, не транслюецца матчы беларускага першынства (прытым гульні NBA на канале „Лад" можна паглядзець). Прыкладам, на апошнім матчы ў Гродне было толькі два дзесяткі заўзятараў. Для каго тады праводзіцца нацыянальны чэмпіянат? Між тым бягучае першынство даволі цікавае з гледзішча інтрыгі. Упершыню няма такога відавочнага фаварыта, якім быў два апошнія гады „Віталюр", а яшчэ раней шмат сезонаў „Гродна-93". Да гэтых прэтэндэнтаў на золата сёлета далучыўся асіповіцкі АЗАА. Так, у апошнім туры (яны складаюцца з дзвюх сустрэчаў) „Віталюр" з АЗАА падзялілі ачкі. А гродзенцы, разграміўшы ў першы дзень віцебскі „Лакаматыў", назаўтра сенсацыйна саступілі ў овертайме. А яшчэ на медалі чэмпіянату, да канца першага этапу якога застаўся адзін тур, будзе прэтэндаваць малады „Мінск-2006". Толькі выступаць без публікі баскетбалістам напэўна сумна.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Выбары солтыса

22 студзеня ў вёсцы Кузава Чаромхаўскай гміны выбіралі солтыса. У мясцовай святліцы сабралася каля сарака жыхароў. Гміну рэпрэзентавалі войт Міхал Врублеўскі, сакратар Гміннай управы Валянціна Кердалевіч і скарбнік Міраслава Кандрацкая-Найбук. Прысутнічала мясцовая радная Альжбета Каліноўская. Гасцей прывітаў солтыс Раман Бішчук. Пасля цырымоніі прывітання, згодна павестцы дня, даў ён справаздачу са сваёй працы за перыяд чатырохгадовых паўнамоцтваў.

— За гэты час, — пачаў солтыс, — была адмалявана святліца як унутры, так і звонку. Фарбу атрымалі мы з гміны. Пры маляванні дапамагаў мне аднавясковец, якога прызначыла гміна. Была пабудавана павець для вугалю (старую ды непрыдатную мы разабралі). Матэрыял на паветку далі мы свой, адно бляху на дах прызначыла гміна. Пры пабудове павеці многа памаглі Пятро Чыквін і Ёзік Саўчук, мясцовыя пенсіянеры. Грошай за гэта яны не бралі. Зрабілі ды замянілі мы дзверы да ганка. У палове тэрміну паўнамоцтваў праверкай фінансавай дакументацыі, якая датычыла здавання ў наймы святліцы ды выдаткаў на грамадскія мэты займалася Гмінная рэвізійная камісія. Паслякантрольных заўваг не было. Зараз, хто хоча зняць святліцу, — працягваў прамоўца, — вымушаны заплаціць адпаведную стаўку дырэктару ГОК у Чаромсе, якая выдае дазвол на імпрэзу. Так рашылі радныя гміны на XVII сесіі. Пры арганізаванні хаўтур (памінак) жыхарам вёскі дазваляецца пакарыстацца святліцай бясплатна.

Кузава з гары

Удзельнікі сходу адобрылі справаздачу солтыса ды рэкамендавалі яго ў кандыдаты на чарговы тэрмін. Прапанавалася яшчэ кандыдатура Мікалая Саўчука (які раней быў солтысам), але гэты адмовіўся. У выніку тайнага галасавання за Рамана Бішчука прагаласавала 29 аднавяскоўцаў, а шэсць галасоў было несапраўдных. Пасля была выбрана Салэцкая рада, у саставе якой увайшлі: Марыя Бішчук, Аліцыя Раманчук, Альжбета Каліноўская ды Яўгенія Сідарук. У ходзе дыскусіі ставілася справа асфальтавання дарогі ў Рэпчычы і пытанне вясковай зямельнай супольнасці.

— Калісьці бацька ўспамінаў, — гаварыў Антон Раманчук, — што ва ўрочышчы *На выгане*, побач дарогі ў Пагулянку было дванаццаць сажняў лесу, які лічыўся вясковай супольнасцю. З грамадскай дзялянкі ссякалі хваіну на пабудову нашай святліцы. Калі мы звярнуліся зараз у гміну, каб дазволілі нам ссячы некалькі соснаў з гэтага ўчастка на ўласныя патрэбы, дык у гміне патрабавалі заплаціць за іх вялікія грошы. Скажыце, калі ласка, дзе дзелася вясковая супольнасць?

У сваю чаргу Уладзімір Сідарук крануў справу святліцы.

— Кажуць, быццам бы кузаўская святліца гміннай уласнасцю стала. Калі так, дык скажыце, шаноўны пан войт, ад калі з'яўляецца яна камунальнай маёмасцю і на аснове якіх законаў была прынята?

Адказ дала сакратар гміны Валянціна Кердалевіч:

— Паводле правілаў вясковая супольнасць не дзеяздольная, таму на аснове закону ад 10 мая 1990 года лес і святліца былі далучаны да камунальнай маёмасці. Была праведзена інвентарызацыя. Адпаведны пратакол ад імя вёскі падпісаў тадышні солтыс. Не значыць гэта, што кузаўцам забралі іхнюю ўласнасць. Вёска з'яўляецца зараз саўладальнікам гэтай маёмасці.

(У.С.)

Павел Давідзюк з Сямятыч

Марыў аб вялікай кар'еры спартсмена і жыцці поўным уражанняў. Адзін скачок у ваду перакрэсліў усё. Згубіў яго ўлюбёны спорт. Ад малога бегаў за мячом, як усе хлопцы. Пасля сямятыцкі настаўнік фізкультуры паставіў на высокага шчуплага хлопца і пераканаў яго, што спорт можа стаць спосабам на жыццё. Павел стаў іграць разам з калегамі ў III гандбольнай лізе. Ездзілі па Польшчы, за мяжу. Здымкі і граматы стаяць дагэтуль на Паўлавай шафцы. На Акадэмію фізкультуры ў Бялай-Падляшскай здаў экзамены прыпяваючы. І ўсё жыццё хлопца кацілася па плану.

Паўлу Давідзюку 26 гадоў. Ад сямі гадоў ён паралізаваны пасля пералому пазваночніка. „Для мяне год пачынаецца не 1 студзеня, — кажа Павел, — а 4 ліпеня. Ад 1999 года. Гэта з таго часу, калі я жыву на інваліднай калясцы".

Спадарыня Ніна, Паўлава мама, якая калісьці пісала ў „Ніву" пад паненскім прозвішчам Матысюк, добра памятае той дзень, калі сын убег, як заўсёды ў хату, кінуў рукзак, крыкнуў што вернецца раней і паляцеў. Не вярнуўся.

— Мы тады скакалі з памоста ў ваду, там, дзе заўсёды. А ў гэты дзень ён быў слізкі, — кажа Павел. — Я пакаўзнуўся, паляцеў тырчма, вертыкальна, і ўдарыў галавой у дно. Выцягнулі мяне калегі.

Лекары ў Беластоку дыягназавалі, што пашкоджаны шыйны пазванок. Казалі мець надзею: чуццё ў руках можа вярнуцца, ды хадзіць не будзе ніколі. Пасля была рэабілітацыя ў беластоцкім шпіталі. На той самай зале ляжала сямёх такіх зухаў — адзін з іх скочыў з лодкі, трапіў у калоду, што праплывала побач, іншы ўвогуле нават і не ўдарыўся ў дно, а ў ваду. Павел чуў пра такія выпадкі раней, ды нават і не падумаў, што здарыцца можа штосьці такое з ім, знакамітым спартсменам.

Што было яму рабіць? Не зламалі яго чорныя думкі. На вучэльні бацькі афармілі яму водпуск па прычыне здароўя. Верылі ў цуд. На другі год водпуску Акадэмія ўжо не дала — адаслалі дакументы дахаты.

Павел, усё ж, далей жыў спортам, адно што ў Інтэрнэце, віртуальна „бегаў" і па старонках свае вучэльні. Нават здабыў у конкурсе Польскага футбольнага таварыства дыск з запісам матчаў польскай зборнай каманды і плакат з подпісам Боньки. Штодзённа практыкуецца з гантэлямі. Наладзіў кантакт з лекаркай са США, якая яго падтрымлівае, каб не паддаваўся: навукоўцы блізкія вынаходства лякарства для людзей з пашкоджаннем спіннога мозгу. А да таго часу трэба трымацца ў добрай кандыцыі. І Павел верыць у гэта. І піша ў Інтэрнэце — і вершы, і рэфлексіі, і заўвагі:

Жыццё зноў задзіўляе, не заўжды пазітыўна, ды трэба заціснуць зубы і рабіць сваё далей. А лягчэй тады гэта робіцца, калі ты пераканаеш, што робіш усё добра. Выспятак ад жыцця бывае для дабра, бо адкрывае табе вочы і паказвае, што тая дарога не была добрая... А так „з іншай бочкі": ... нават у дажджлівых краінах на канец выгляне сонца...

... Калі Бог зачыняе дзверы, дык адчыніць акно. Колькі ж раз я аб гэтым пераканаўся, цяжка нават злічыць...

У гэтай цудоўнай краіне вырас я моцны, заўжды быў там патрэбны, навучылі мяне змагацца, навучылі мяне перамагаць, і ніколі ў мяне не было думкі, што магу расчараваць. Цяпер кажуць, што няма мне за што змагацца. Ды ім так здаецца! Я чалавек, здзяйсненне мар якога не так далёка! Нікому ты непатрэбны, калі прайгрываеш...

— Толькі моцная вера ў тое, што я стану на ногі, дазваляе мне перажыць найцяжэйшыя хвіліны. Я прабую перамагчы сваю нямогласць. Мая адна мара — хадзіць. Бальніцы, кансультацыі і кантакты з клінікамі — таксама за мяжой — даюць надзею. Прабавалі мне памагчы лекары амаль з усяго свету, м.інш. доктар Карлас Ліма з Лісабона, доктар Гуанг з Пекіна, прафесар Брухавецкі з Масквы, прафесар Рабіновіч з Новасібірска. У Пекіне меў я ўжо вызначаны тэрмін аперацыі. Але аперацыя на спінным мозгу гэта канчатковасць. Да таго адна працэдура дамозгавай трансплантацыі глеевых нюхавых клетак каштуе ад 15 тысяч еўра да 60 тысяч долараў (у залежнасці ад клінікі). А вынікаў можна спадзявацца праз пару працэдур. Ад году паддаюся наватарскай курацыі доктара Анатоля Яско з Благавешчанска ў Расіі. Праходжу вельмі інтэнсіўную рэабілітацыю. За мною ўжо першы цыкл лячэння. Год такога лячэння гэта 5 тысяч долараў. Таму звяртаюся да людзей добрай волі з просьбай падтрымаць мяне ў збіранні сродкаў на далейшае лячэнне і рэабілітацыю, — просіць Павел.

Падтрымаць Паўла Давідзюка можна, уплачваючы 1% свайго даходнага падатку на Фонд дзецям „Паспець з дапамогай", на спецыяльны рахунак:

Fundacja Dzieciom „Zdążyć z Pomocą", ul. Łomiańska 5, 01-685 Warszawa, konto: 67 1240 1037 1111 0010 0583 9813, tytuł wpłaty: „3791, podatek 1%".

Паўлу Давідзюку можна напісаць: dawidziuk@wp.pl, 17-300 Siemiatycze, ul. Kościelna 4B/10.

Міра ЛУКША

Адгалоска

Панове, у пятым нумары вашае газеты прачытаў я Чобата пра Грынявіцкіх. Нічога новага, голая публіцыстыка. Ну, хіба што пан Чобат памыліўся: Андрэй Жалябаў не быў дваранінам — мужыком, якога кахала генеральская дачка. Як і ў другім матэрыяле (ён стаіць першым) памылкова назваў Вацлава Іваноўскага заснавальнікам „Нашае Нівы". А канцэпцыя знаёмая і вядомая: жыды і палякі. Дадайце каталікоў, бо Ігнат Грынявіцкі, хай будзе Чобату ведама, быў вельмі пабожным каталікам, калі вучыўся ў Беластоку. Пра тое ёсць сведчанне ягонага законавучыцеля, пераказанае ксяндзом Уладзіславам Талочкам. Вось такія — рэлігійныя ці з рэлігійна-царкоўнага асяроддзя — нярэдка станавіліся рэвалюцыянерамі: Сталін, Мікаян, хто там яшчэ?.. Не палякі і не жыды. Кастра ў езуітаў вучыўся... Але каб да гэтага — пра сувязь паміж шчыраю вераю і рэвалюцыйнасцю — дадумацца, Чобату належала пачытаць сякія-такія паперы ў Бібліятэцы Літоўскае акадэміі. Ну, а так напісана жыва. З найлепшымі пажаданнямі

Анатоль СІДАРЭВІЧ, Мінск

Мінулае Аўгустова

Мінулае Аўгустова, што знаходзіцца ў 3 кіламетрах на захад ад Бельска-Падляшскага, тоіць шмат загадак.

Назва „Аўгустова" у мясцовай гаворцы вымаўляецца „Ягуштова" або „Егуштова". Слова „Егуштова" зыходзіць да эпохі, калі гэтыя землі насялялі балтыйскія плямёны. У латышскай мове „егуозіс" абазначае „невялікую даліну" або ўпадзіну ў полі, што адпавядае рэльефу тэрыторыі, на якой ляжыць Аўгустова.

Побач вёскі цячэ рачулка Любка. Назва яе, несумненна, ад літоўскага „лёбас" — „нізінны луг", „вузкая доўгая даліна". Успамагае гэтыя меркаванні факт, што на аўгустоўскім полі знаходзяцца два курганы. Распалажэнне іх і кераміка, якую там знаходзяць, падказвае, што яны адносяцца да адлеглай эпохі. Ва ўрочышчы *Міжгоры* селянін з Аўгустова выараў скарб сярэдневяковых манет. Гэта даказвае, што засяленне гэтых ваколіц ад балтыйскага перыяду да славянскага не мела вялікіх перапынкаў. Людзі тут жылі і гаспадарылі на працягу 1530 год.

(мох)

Літаратурны конкурс „Міфы і легенды ад Нёмана да Буга"

Згуртаванне „Uroczysko", Вышэйшая школа публічнай адміністрацыі ў Беластоку і Цэнтр грамадскіх ініцыятыў „Трэці сектар" у Гродне аб'явілі адкрыты літаратурны конкурс. Яго мэтай з'яўляецца сабранне непублікаваных літаратурных твораў (эсэ, апавяданне, верш), апісваючых легенды, міфы і звычаі з тэрыторыі Падляшша і Гродзеншчыны. На гэтых землях бытуе яшчэ шмат гісторый, якія дагэтуль не былі дакладна даследаваныя, а з'яўляюцца цікавай часткай шматкультурнай гісторыі людзей, пражываючых у гэтым рэгіёне. Арганізатары звяртаюцца да ўсіх удзельнікаў конкурсу, каб у літаратурнай форме захавалі ад забыцця арыгінальныя гісторыі, паданні, міфы і каб захацелі прыпомніць іх не толькі этнографам і гісторыкам, але і ўсяму шырокаму колу людзей, якім блізкая культура. Для арганізатараў важна таксама, каб аўтары дакладна акрэслілі рэгіён, з якога паходзяць апавяданні, а таксама людзей, ад якіх ведаюць гэтыя гісторыі.

Працы трэба даслаць да 15 сакавіка 2007 г. на паштовы адрас: ***Stowarzyszenie Uroczysko, ul. Piłsudskiego 58, 16-030 Supraśl*****, або на электронны:** uroczysko@uroczysko.pl

Максімальны аб'ём прац — 10 старонак (1 800 знакаў на старонцы).

Завяршэнне конкурсу адбудзецца 30 сакавіка 2007 г. Узнагароды будуць уручаны на літаратурным вечары ў час Сустрэч з натурай і мастацтвам „Uroczysko" ў чэрвені.

Узнагароджаныя капітулам конкурсу працы будуць прадстаўлены ў час XII „Uroczyska" ў Супраслі (аўтарам з-па-за Беластока гарантуецца начлег і харчаванне), а пасля апублікаваныя ў кнізе „Міфы і легенды ад Нёмана да Буга" (польска-беларускае выданне) восенню 2007 г., аўтары атрымаюць каштоўныя кніжныя ўзнагароды. Найбольш цікавая праца будзе падставай сцэнарыя пленэрнай пастаноўкі ў Кнышынскай пушчы ў час „Uroczyska" ў чэрвені 2007 г.

(лук)

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2007 r. upływa 5 marca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 884 egz.

Суседскія былі

КІТАЙСКІ КОМПАС

— А за што цябе кінулі на нары? — запытаў мяне сусед, з непрыкрытай радасцю ад таго, што мне прыйшлося адсядзець сем сутак у смярдзючай камеры з яго сябрамі алкаголікамі.

Мужчына ён быў добры. Калі што трэба, заўсёды дапаможа. Нікому нічога благога не жадаў. Толькі вось занадта любіў чысціню крыштальнага бляску таямнічых агеньчыкаў, якія дае гарэлка, што зіхаціць на рубах гранёнай шклянкі ў святле неонавых лямпаў ліцейнага цэха гродзенскага завода такарных патронаў. Таму яго шлях з працоўнага месца да хаты час ад часу мяняў прамы маршрут і праходзіў праз ласкавасць міліцэйскага пастарунка, дзе Іван, так звалі суседа, набраўся моцнай нястрыманасці да людзей ідэі. Бо тыя, калі патраплялі па нейкіх прычынах з ім у камеру, часцей за ўсё пасля несанкцыянаваных мітынгаў (а гэта стала даволі частай з'явай на пачатку дваццаць першага стагоддзя), увесь час нылі, што Іван зашмат курыць і прасілі не выслаўляцца брудным расійскім матам. А яшчэ нудзілі яго доўгімі размовамі пра раздзяленне галінаў улады і аптымальнасць выбару эканамічнага курсу Беларусі. Праўда былі ў тым і добрыя бакі. Зараз Іван лічыў сябе палітычна падкаваным чалавекам, які разбіраецца ва ўсіх нюансах знешнеэканамічных стасункаў краіны і заўсёды ахвотна ўступаў у спрэчкі на тэмы беларуска-расійскіх адносін. Казаў, што галоўная памылка апазіцыі ў тым, што ніяк не можа ўцяміць, што Беларусь без Расіі не пражыве. І хаўруснікаў сабе мусіць шукаць на ўсходзе, а не на сытым захадзе, дзе мы, маўляў, нікому з нашым трактарам „Беларус" і тэлевізарамі „Гарызонт" непатрэбныя. А ў астатнім цалкам пагаджаўся з існымі апанентамі сённяшняй улады.

— Што, матам на вуліцы лаяўся? — усё весялей дапытваў мяне Іван.

— Так вырашылі ў судзе, — махнуў рукой я і пастараўся хутчэй пазбавіцца ад суседа і бессэнсоўнасці распачатай ім спрэчкі. — Няма мне чаго табе сказаць больш. Хоць ты добра ведаеш, што я па-расійску не размаўляю? І таму ніякім матам гаварыць не мог у прынцыпе. А віна ўсяму прэзідэнцкія выбары. Скажам так, мяне нейтралізавалі як умелі. Прамаскоўская палітыка, што зробіш.

Апошнія словы былі вялікай памылкай. Сусед ухапіўся за іх, як тапелец за саломку.

— А ведаеш, пакуль ты сядзеў, наш урад яшчэ аднаго саюзніка сабе прыдбаў. Кітай! Вось гэта правільны ход. Тут я пагаджаюся. Паглядзі толькі, які гэта вялікі рынак для нашых тавараў. А іхныя рэчы вельмі танныя. Таксама добра будзе, калі ў нас з'явяцца.

Я зарагатаў як абкураны канаплёй панк, бо толькі што ў камеры расказвалі мне два небаракі пра кітайскі танны тавар.

— Паслухай, Ваня, — кажу яму. — Ты добры хлопец. Ну і, зрэшты, суседзяў не выбіраюць. Якога лёс паслаў, такога і цярпі. Вось і там, адкуль я толькі што вырваўся, і абганяючы грамадскі і асабісты транспарт прынёсся дахаты як сабака ад ваўка, былі ў мяне два суседы па камеры. То хачу табе распавесці пра іх няпросты руцінны шлях, што прывёў бедакоў з сонечнага Казахстана на гродзенскія нары. Толькі зразу пачну з таго, каб ты не абвінавацій мяне ў прадузятасці, што я з вялікай павагай стаўлюся да складанага пакутніцкага шляху братняга расійскага народа, гэтак жа, як і да старадаўняй шматтысячагадовай кітайскай культуры. Нават не зважаючы на абсурдныя агульнанацыянальныя праекты ў выглядзе вялікай сцяны, культурнай рэвалюцыі, ці, што нас усіх, на жаль, гістарычна яднае, прыманне непагрэшнасці марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Але гаворка не пра былыя часы, а пра сёння. І тут ужо трэба думаць, да каго мы бліжэй. Ну добра, прабач, занесла мяне ў палітыку. Дык вось слухай. Дзвюм нядолям, якія зараз яшчэ выціраюць сваімі задніцамі камерныя дошкі, вельмі няўтульна стала на сваёй Радзіме, значыць, у Казахстане. Хоць яны там нарадзіліся, але вочы мелі завялікія і па нацыянальнасці і знешнім выглядзе не адпавядалі прыроднаму ландшафту. Адзін быў нашчадак рускіх бацькоў, другі латышскіх. Адным словам, як іх зараз называюць — рускамоўныя. Вось як ты. І здалося ім, а можа і праўда, што ў цяперашнім Казахстане з няправільным разрэзам вачэй перспектывы выбіцца ў людзі адсутнічаюць цалкам. Таму і вырашылі сігануць куды далей ад ласкавага паўднёвага сонца. Ды чамусьці не ў Расію, а на Захад. У іх там і знаёмыя знайшліся, што яшчэ раней збеглі. І гэта добра, бо працу там ужо надбалі сабе, і гэтым уцекачам прыгледзілі цёплае месца ў кітайскім рэстаране недалёка ад Франкфурта. А яшчэ падрабязны план пераходу беларуска-польскай мяжы прыслалі. Гэта ж зараз адзіная мяжа, якую перайсці цяжка. І хлопцы зрабілі ўсё, як іх вучылі новаеўрапейскія шчасліўцы. Прыехалі ў Гродна, пайшлі да нейкай вёскі, там далей у лес, дасядзелі да паўночы ў гурбах і ў адпаведны час, калі найбольш спрыяльна, дасталі заранёў набыты компас ды рушылі на захад. Усё як іх вучылі. Ідуць сабе, ідуць, а калючага дроту няма і няма. Хоць па ўсіх разліках ужо і Польшчу мусілі мінуць. А тут раптам беларуская застава як з-пад зямлі вырасла. Памежнікі ўзялі іх, што называецца, цёпленькімі. У самы момант мяркуемага правапарушэння. А пасля ўся застава рагатала, як агульнасаюзны дом вар'ятаў, што ўбачыў палец. Памежнікі даведаліся ў чым справа. Компас быў кітайскі і паказваў зусім іншы кірунак, чым павінен гэта рабіць дакладны арыентацыйны прыбор. І хлопцы тыя, замест перасячы мяжу, увесь час ішлі паралельна ёй. Пакуль не прыйшлі ў прыветлівую камеру для арыштаваных. Ну і скажы зараз мне, ці вабяць цябе тыя танныя тавары і тыя хаўруснікі?

На маё здзіўленне Іван заплакаў. Я аж запаважаў гэтага чалавека, што лёс двух чужакоў яму неабыякавы. Дзе цяпер знойдзеш такое спачуванне і цеплыню суровай мужчынскай натуры. Але праз хвіліну сусед схамянуўся, вылаяўся як звычайна перад пачаткам новага сказа і гаворыць:

— Твая ўзяла. Праўду кажаш. Нельга купляць тавар падазроных вытворцаў. Вось і я, дурань, купіў пральную машыну-аўтамат кітайскай вытворчасці. На апошнія грошы. На танны кошт спакусіўся, балван. Лепш бы я іх прапіў, тыя грошы, хоць нейкая радасць была б. Як думаеш, шмат тая машына не напрацуе?

— Вось колькі ты на тыя грошы піў бы, столькі яна і папрацуе, — пажартаваў я.

— А халера! — махнуў рукой сусед і зноў вылаяўся. — Што ж ты мне раней гэтай гісторыі не расказаў. Грошай шкода.

І зноў заплакаў.

Віктар САЗОНАЎ

25.02 – 3.03

Баран (22.03. — 20.04.) Добры настрой, аптымізм, падтрымка кіраўніцтва ў тваіх важных мерапрыемствах. У пары папсуе лады квадратура Марса і Юно. Можаш кіраваць людзьмі так, каб ведалі, што тваё слова — апошняе.

Бык (21.04. — 21.05.) Энергіі ў табе столькі, што можаш горы пераносіць! Вырашыш загадку, якая табе даўно не давала спаць. Памятай, што на развітанне кожны момант добры, але на вяртанне можа быць запозна.

Блізняты (22.05. — 21.06.) Будзеш паспяховы і эфектыўны. Пры знаёмстве з новай асобай зважай — можа між вамі народзіцца жарснае пачуццё, ды можа быць яно табе не да дабра. Разлічвай на моцную падтрымку найбліжэйшых людзей. Шмат спраў можаш папхнуць наперад.

Рак (22.06. — 23.07.) Пашчасціца ў падарожжах, асабліва разам з Рыбамі. Дома не ўсё паладзіш, а тое, што псуецца, будзе даводзіць цябе да шалу. Нечаканыя выдаткі, але і магчымасць зарабіць. Добры настрой — да шчасця ж табе хапае няшмат!

Леў (24.07. — 23.08.) Шмат запалу, аптымізмам заразіш іншых. Можаш вызначыць новыя планы, якіх рэалізацыя захопіць цябе поўнасцю. Найбліжэйшыя могуць абцяжарваць цябе сваімі справамі. Хтосьці можа выкарыстаць твой давер.

Дзева (24.08. — 23.09.) Мусіш быць пластычным у планах, спадзявацца сюрпрызаў. Работа проста зваліцца табе на галаву; справішся пры добрай арганізацыі. Можаш крыху пасварыцца з блізкімі, ды хутка забудзеце пра справу. Месяц люты кончыш на плюсе.

Шалі (24.09. — 23.10.) Вялікі апетыт на жыццё, жарсці; будзе пра што ўспамінаць. Можаш падумаць пра новую дарогу жыцця, можа, пра работу „на сваім". Не шкадуй сабе ўзнагарод і прыемнасцей.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Можаш наладзіць знакаміты інтарэс, каб забяспечыць сваю будучыню. Будзь праніклівы, лоўкі, пераконваючы — зробіш уражанне. У выпадку праблем з ныркамі, пі крынічную ваду, гатуй на фільтраванай.

Стралец (23.11. — 22.12.) Цікавыя прапановы для сэрца. Ад блізкіх многа цяпла і падтрымкі; адплаці гэтым самым. У суполкі лепш не ўваходзь, бо не схочацца пасля дзяліцца прыбыткам.

Казярог (23.12. — 20.01.) Жыццё пазбавіць цябе ілюзій. Мусіш памерацца з рэчаіснасцю, якая можа аказацца іншай, чым ты думаў. Мілыя імпрэзы, сустрэчы са сваякамі; можаш атрымаць запрашэнне на вяселле.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Аддыхаешся і напоўнішся надзеяй. Нястрашныя будуць выклікі, радасна кінешся ў плынь жыцця. Мілыя знаёмствы; варта запланаваць падарожжа. Грошай хопіць нават на збыткі.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Зваліцца на цябе ладны кавал работы, на якую не маеш ахвоты, тым больш, што можа яна пайсці на змарнаванне (не пашкодзіць табе гэта ў фінансах). Абачлівасць і ўменне весці перамовы памогуць табе ў інтарэсах. Калі працуеш на камп'ютэры, зважай на свае запясці.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

Шыфраграма

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22								

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне: афарызм Рамона Гомеса дэ ла Серны.

1. карэйская грашовая адзінка = 15 _ 16 _ 18 _ 22 _;
2. квадратны корань з чатырох = 1 _ 13 _ 14 _;
3. група спартыўных каманд, парытэтная па майстэрстве, якія спаборнічаюць паміж сабой = 10 _ 11 _ 4 _ 9 _;
4. імгненне = 3 _ 19 _ 17 _;
5. асноўны змест разважання, выкладу думкі, твора = 6 _ 5 _ 8 _ 7 _;
6. прадмет старажытнай ручной зброі ў выглядзе круглаватай прамавугольнай плоскасці для засцярогі ад удараў кап'я, мяча або стрэл = 20 _ 21 _ 2 _ 12 _. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 3 нумара

Чытач, панцыр, палец, клуня, качан, зязюля, хобі, зяць, Баранавічы, дзюдо.

Рашэнне: **Па нітачцы клубочак знаходзяць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Яну Міхалюку** з Чыжоў і **Анатолю Маўчуну** з Познані.

ISSN 0546-1960